

МІНСК: ПРАБЛЕМЫ РОСТУ

8

ЯК ЗНАЙСЦІ АДПАВЕДНІК СЛОВУ «ТРЭНЧ»

21



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

26 ЛЮТАГА 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 37 (29406)

+TV ПРАГРАМА
МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ, рэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце, кандыдат гістарычных навук:**

*«Нам неабходна ўзяць актыўны ўдзел у вызначэнні даты Дня народнага адзінства. Гэта вельмі важна, таму што гэты дзень датычыцца ўсіх грамадзян. Устанаўленне такога дня паспрыяе, з аднаго боку, захаванню аб'ектыўнай гістарычнай памяці аб знакавых падзеях у жыцці нашага народа і дзяржавы. З іншага боку, гэта неабходна ў сучасных умовах інфармацыйнай гібрыднай вайны, калі спрабуюць фальсіфікаваць і сказіць гістарычныя падзеі. І ў першую чаргу спробам фальсіфікацыі падвяргаюцца якраз падзеі Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны, якія мелі велізарнае значэнне для беларускага народа. Я лічу, што ў нас ёсць усе неабходныя гістарычныя, навуковыя абгрунтаванні для таго, каб устанавіць Дзень народнага адзінства ў нашай краіне».*

## КОРАТКА

- Прагаласаваць за выбар даты дзяржаўнага свята — Дзень народнага адзінства можна на сайце Усебеларускага народнага сходу https://vsebel.by/.
- **Беларускі лёгкаатлет Ірына Жук абнавіла нацыянальны рэкорд у скачках з шастом.**



ISSN 1990 — 763X
21037



# Пазітыўна на вуліцы Гомельскай

А як інакш?! Падпісчыца «Звязды» з трыццацігадовым стажам, былы школьны філолаг Ніна КАЛЫХАН на жыццё глядзіць вельмі аптымістычна, хоць у былой чарнобыльскай перасяленкі наракання на лёс было шмат. Ніна Васілеўна распавяла, што гэтую вуліцу на ўскраіне Маладзечна для пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС пабудавалі ў 1991 годзе і назвалі Гомельскай, на ёй пасяліліся ўраджэнцы Хойніцкага раёна. За гэты час палешукі сталі сваімі, бо ніколі не страчвалі надзеі на лепшае, добра працавалі, гадавалі дзяцей, актыўна ўключаліся ў грамадскую работу — і з імі заўсёды вiравала мясцовае жыццё. А яшчэ сябравалі з беларускімі газетамі і часопісамі. Ніна Васілеўна не ўяўляе свой дом без нашай газеты і штодня чакае паштальёна.

— Сваю маленькую радзіму жыхары вуліцы Гомельскай ніколі не забываюць, — дзеліцца пенсіянерка. — У прыгожым месцы, каля крыніцы, мы паставілі помнік чарнобыльцам-перасяленцам, кожны год збіраемся каля яго. Вось і сёлета, у канцы красавіка, мы зноў збяромся разам.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

*Маладзечанскі раён.*

## Размова па сутнасці

**Ігар КАРПЕНКА:**

# «Адукацыя — гарант сацыяльнай стабільнасці ў грамадстве»



Фота прэс-службы Міністэрства адукацыі.

**У Беларусі завяршаецца распрацоўка праекта Канцэпцыі развіцця сістэмы адукацыі да 2030 года. Дакумент будзе размешчаны на афіцыйным сайце Мністэрства адукацыі для абмеркавання, а ў далейшым вынесены на разгляд Рэспубліканскага педагагічнага савета, які плануецца правесці ў жніўні гэтага года. У аснову канцэпцыі будуць пакладзены даручэнні кіраўніка дзяржавы, дадзеныя ім на Усебеларускім народным сходзе. Галоўныя прынцыпы застануцца нязменныя: гэта дзяржаўна-грамадскі характар кіравання сістэмай адукацыі, сацыяльная справядлівасць, роўны доступ да адукацыі і павышэнне яе якасці. Аб прыярытэтах у адукацыі, вопыце работы ва ўмовах пандэміі каранавіруса і ідэалагічным складніку ў выхаванні мы задалі пытанні міністру адукацыі нашай краіны Ігару КАРПЕНКУ.**

СТАР. 4—5

## Свая справа

# СТВАРАЛЬНЫ БІЗНЕС СЯРГЕЯ КУЦАНАВА

### Прадпрымальнік — пра вытворчасць на перыферыі і адказнасць перад сабой і людзьмі

**Сідаравічы — невялікі аграгарадок паміж Магілёвам і Быхавам. Менавіта тут знаходзіцца вядомая ў Магілёўскім раёне фермерская гаспадарка Сяргея КУЦАНАВА. Ён ураджэнец гэтага населенага пункта, таму і бізнес стварыў на малой радзіме. Фермерства, дарэчы, не адзіны кірунак яго дзейнасці. Прадпрымальнік яшчэ і дамы будуе, і мэблю робіць, і рыбу вырошчвае. Сам справай займаецца і аднавяскоўцам работу дае. І вельмі абураецца, калі нехта называе яго камерсантам. «Не трэба нас блытаць з перакупшчыкамі, — кажа ён. — Я — вытворца, ствараю карысны прадукт, які карыстаецца попытам. І ў гэтым прынцыповая розніца».**

СТАР. 5



**Вуліца, якая з'явілася ў Сідаравічах дзякуючы Сяргею КУЦАНАВУ.**

# «Сёння бяспека шматбаковая: ад харчовай і ў цэлым эканамічнай да ваенных пагроз»

З першых вуснаў

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам дзяржаўнага сакратара Савета бяспекі Аляксандра Вальфовіча, які нядаўна быў прызначаны на гэту пасаду.**



Фота БелТА.

Асноўнае пытанне — склад і функцыяванне Савета бяспекі, абазначыў кіраўнік дзяржавы. Паводле слоў Прэзідэнта, работу органа «ў адпаведнасці з нашымі ўмовамі трэба выбудаваць сур'ёзна, а недзе і перабудаваць», вывучыўшы вопыт Расіі, Казахстана, іншых дзяржаў.

Вышэйшы калегіяльны каардынацыйны орган, які рэалізуе паўнамоцтвы кіраўніка дзяржавы ў галіне забеспячэння нацыянальнай бяспекі, якім з'яўляецца Савет бяспекі, павінен збірацца рэгулярна, на ім належыць абмяркоўваць фундаментальныя пытанні абароны дзяржавы, падкрэсліў Прэзідэнт. «Сёння бяспека шматбаковая: ад харчовай і ў цэлым эканамічнай да ваенных пагроз, — дадаў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да Аляксандра Вальфовіча. — Таму занадта шырокі спектр пытанняў, якія належыць вырашаць. Думаю, за гэты час вы ўнiклi ў сітуацыю як вопытны штабіст. Гэта практычна штаб, толькі на самым высокім узроўні — штаб Прэзідэнта па абароне і бяспецы».

Другое пытанне парадку дня сустрэчы — забеспячэнне стабільнасці ўнутры Беларусі сёлета. «Вельмі будзе няпросты год, і не толькі таму, што ёсць некаторае недастатковае разуменне ў грамадстве працэсаў развіцця Беларусі, жаданне некаторых унутраных сіл і, асабліва, знешніх дэстабілізаваць абстаноўку», — паняпярэдзіў беларускі лідар. Ціск адбываецца па ўсіх кірунках, нават у спорце, заўважыў ён. «Вы бачыце, што паціху-паціху, не кіем, дык палкай хочуць расхістаць Беларусь. І сігналы (не проста сігналы, а канкрэтныя дзеянні) ідуць з-за мяжы. На шчасце, мы выявілі ўсе гэтыя цэнтры, ведаем усіх гэтых «змагароў» і збеглых з Беларусі, але ведаць мала — гэтаму трэба супрацьстаяць, — абазначыў задачы Аляксандр Лукашэнка. — Усё трэба да дробязі прадугледзець з улікам вопыту і Беларусі, і Расіі, і Арменіі, і Кыргызстана, і Украіны (вы бачыце, успыхнула зноў Украіна), і іншых постсавецкіх рэспублік».

Прэзідэнт выказаў гатоўнасць таксама абмеркаваць кадравыя пытанні і пытанні прысваення воінскіх званняў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

**• У тэму**

У дзяржаўных органах, якія забяспечваюць нацыянальную сістэму бяспекі, на сёння арганізаваны дастатковы ўзровень узаемадзеяння, паведаміў журналістам па выніках даклада Прэзідэнту дзяржсакратар Аляксандр Вальфовіч.

«Ведамствы сілавога блоку здольныя вырашаць задачы па забеспячэнні правапарадку ў нашай краіне, у адпаведнасці з іх прызначэннем, — сказаў ён. — Акрамя таго, яны гатовыя да любых змен як знешняй, так і ўнутранай палітычнай абстаноўкі».

«Ведамствам сілавога блока належыць асаблівая роля забяспечыць устойлівае функцыянаванне эканамічнай і палітычнай сістэм грамадства. Сёння тая сістэма нацыянальнай бяспекі, якая створана ў нашай краіне, забяспечвае вырашэнне гэтых важных задач, — лічыць кіраўнік сакратарыята Савета бяспекі. — Беларускі народ можа быць спакойны: мы гарантуем мірную працу, годнае жыццё ў нашай краіне пад кіраўніцтвам нашага Прэзідэнта».

Што датычыцца складу Савета бяспекі, то дзяржсакратар прапануе ў лік пастаянных яго членаў уключыць міністраў абароны і ўнутраных спраў, а таксама старшыню Камітэта дзяржаўнай бяспекі. У хуткім часе кіраўніку дзяржавы будзе прадстаўлены праект адпаведнага ўказа.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Сі Цзіньпін заявіў пра перамогу над беднасцю ў Кітаі



У Кітаі ўдалося цалкам пераадолець беднасць, абвясціў старшыня КНР Сі Цзіньпін, перадаў «Інтэрфакс». «Цяжкая задача ліквідацыі беднасці вырашана, галеча ў рэгіянальным маштабе пераадолена», — сказаў ён, выступаючы на нацыянальнай выніковай канферэнцыі па барацьбе з беднасцю. Сі Цзіньпін адзначыў, што са стану галечы і беднасці «сумеснымі намаганнямі партыі і народа» ўдалося вывесці 98,9 мільёна сельскіх жыхароў і 128 тысяч вёсак. «З абсалютнай галечай скончана, здзейснены яшчэ адзін гістарычны цуд!» — падкрэсліў кітайскі кіраўнік, адзначыўшы, што гэтага ўдалося дасягнуць напярэдадні 100-годдзя з дня заснавання Кампартыі Кітая (будзе адзначацца сёлета 23 ліпеня).

### Аўстралія прыняла закон аб плаце інтэрнэт-платформаў за кантэнт навін

Аўстралійскі парламент прыняў новы закон, які заклікаюць прымусіць Google і Facebook плаціць медыякампаніям за кантэнт, што выкарыстоўваецца на іх платформах. Урад зможа рабіць гэта ў выпадку, калі тэхналагічныя гіганты не дамовяцца з аўстралійскімі медыя аб супрацоўніцтве, паведаміла Reuters. «Кодэкс забяспечыць, каб навінавыя медыякампаніі атрымлівалі справядлівае ўзнагароджанне за кантэнт, які яны генерыруюць, дапамагаючы падтрымліваць грамадскую журналістыку ў Аўстраліі», — адзначаецца ў сумеснай заяве скарбніка Джоша Фрыдэнберга і міністра сувязі Пола Флетчара. Аўстралія стане першай краінай, дзе ўрад будзе прымаць рашэнне аб цане, якую заплацяць тэхналагічныя гіганты, калі іх камерцыйныя перагаворы з выданнямі краіны праваляцца, адзначыла Reuters. Законапраект, які прайшоў галасаванне ў парламенце, быў зроблены больш мяккім пасля таго, як Facebook заблакаваў усе навіны ў сваёй сацсетцы для аўстралійскіх карыстальнікаў.

### У Іспаніі знеслі апошні помнік Франка



Апошняя статуя генерала Франсіска Франка ў Іспаніі была прыбраная пасля таго, як анклаў Мелілья прагаласаваў за знос помніка фашысцкаму дыктатару. Рабочыя дэмантавалі статую, якая стаяла каля брамы горада, паведаміў BBC News. Алена Фернандэс Трэвіна, член Асамблеі Мелільі, назвала дэмантаж статуі ў анклаве «гістарычным днём». Толькі адна партыя выступіла супраць зносу. У 2007 годзе былі прыняты закон аб гістарычнай памяці, згодна з якім сімвалы дыктатуры Франка павінны быць паступова знішчаны. Франка быў пахаваны ў маўзалеі пад назвай «Даліна Загінулых», недалёка ад Мадрыда, побач з дзясяткамі тысяч ахвяр грамадзянскай вайны 1930-х гадоў. У 2019-м па рашэнні іспанскіх уладаў астанкі Франка былі перапахаваныя на могілках Мінгарубіа ў Мадрыдзе. Нашчадкі дыктатара не змаглі адстаяць у судзе права на захаванне першага пахавання.

Медыяпрастора

# ШМАТ УВАГІ АДДАДЗЕНА ІНФАРМАЦЫЙНАМУ СУВЕРЭНІТЭТУ

**У Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь прайшла калегія, дзе былі падведзены вынікі работы галіны ў 2020 годзе і вызначаны мэты і задачы на 2021 год.**

«Мінулы год быў складаны. Мы шмат увагі аддалі праблемам інфармацыйнага суверэнітэту, якія паставіў перад намі 2020 год. Сёння варта зрабіць акцэнт на інтэрнэт-вяшчанні, рабоце з сацыяльнымі сеткамі і месенджарамі, гэта найважнейшы кірунак у нашай рабоце. Раней мы не вельмі добра развіваліся ў гэтым кірунку, але жнівень 2020 года паказаў, што ў нас ёсць магутнасці і рэзервы, у тым ліку і кадравыя, якія дапамаглі выстаяць у няпросты час. Магутны рэсурс таксама і тэлебачанне. Што датычыцца друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, то мы назіраем пераход аўдыторыі ў інтэрнэт, і друкаваная прэса павінна змяняцца. Мы павінны адысці ад навіннага кантэнту ў друкаваных СМІ і сканцэнтравацца на аналітыцы і расследаваннях — матэрыялах, якія будуць аналізаваць сітуацыю, а не даваць яе адлюстраванне», — адзначыў **міністр інфармацыі Ігар ЛУЦКІ.**

Удзельнікі калегіі абмеркавалі работу рэгіянальнай прэсы і ўнеслі прапановы па яе ўдасканаленні. «Мы павінны згрупаваць рэгіянальныя друкаваныя СМІ ў адзіны кулак. У сувязі з гэтым неабходна падпарадкаваць раённую прэсу аблвыканкамам ці стварыць холдынгі на базе абласных газет. Гэта дазволіць аптымізаваць затраты і ў пэўнай ступені развязаць рукі журналістам», — падкрэсліў міністр.



Фота БелТА.

Асаблівая ўвага была ўдзелена рабоце прэс-службаў. Па словах Ігара Луцкага, Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 65 «Аб удасканаленні работы дзяржаўных органаў, іншых дзяржаўных арганізацый са сродкамі масавай інфармацыі» ніхто не адмяняў. У той жа час Міністэрства інфармацыі не павінна быць PR-службай іншых галін, гэтым трэба займацца ўнутры галін і ведамстваў. Удзельнікі калегіі абмеркавалі, як выправіць некаторыя недахопы ў гэтым дачыненні.

Ігар Луцкі падкрэсліў, што, нягледзячы на ўсе цяжкасці, 2020 год дазволіў беларускай журналістыцы раскрыцца ва ўсёй красе: «Было створана шмат магутных журналісцкіх матэрыялаў, з'явіліся лідары меркаванняў сярод журналістаў. І гэта вельмі важны момант».

Выступаючы падчас калегіі Мінінфарма, **намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА** адзначыў: «За апошнія паўгода роля СМІ настолькі ўзрасла, што гэта нават складана ацаніць. Сёння працэсы, якія адбываюцца ў студэнцкім, маладзёжным асяроддзі і нават у працоўных калектывах, шмат у чым залежаць ад таго, як працуюць СМІ. А таксама ад таго, наколькі выразна мы фарміруем інфармацыйны парадак дня, наколькі аператыўна выкрываем спробы дэструктыўнага ўплыву на наша грамадства. Падрыхтоўка да VI Усебеларускага народнага сходу паказала, што ў міністэрстве выбудавана сістэмная работа ў медыясферы, наладжана ўзаемадзеянне са СМІ ўсіх узроўняў. СМІ ў сваю чаргу прадэманстравалі ўменне хутка перабудоўвацца, працаваць актыўна, ярка падаваць інфармацыю». «Летась сродкі масавай інфармацыі ў цэлым працавалі паспяхова, імкнуліся максімальна эфектыўна выконваць свае функцыі. Наяўныя дасягненні — гэта вынік працы журналістаў, іх прафесіяналізму, неабыякавасці, цвёрдай грамадзянскай пазіцыі», — даў ацэнку віцэ-прэм'ер.

Ігар Петрышэнка падкрэсліў: друкаваныя СМІ, нягледзячы на глабальную лічбавізацыю, складаюць значны сегмент інфармацыйнага поля краіны. Паводле яго слоў, кантэнт, які прапануецца чытачам, павінен быць унікальны і якасна адрозніваецца ад таго, што можна знайсці на інтэрнэт-рэсурсах. Тым больш што на фоне фэйкавых навін, інфармацыйных укідаў у аўдыторыі ўзнікае запыт на прафесійную і аб'ектыўную журналістыку. Намеснік прэм'ер-міністра ўпэўнены, што друкаваныя СМІ павінны больш актыўна працаваць у інтэрнэт-прасторы.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Блізкая ўлада

## З НАРОДАМ ГУТАРКУ ВЕСЦІ

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай «вертыкаллю» працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

Тэлефонныя лініі ў суботу 27 лютага, з 9.00 да 12.00 праводзяць:

• намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;

• намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Пятровіч ПЕНІН. Тэл. 8 021 222 22 22;

• першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Ігар Мікалаевіч ЧАСНОК. Тэл. 8 023 233 12 37;

• намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віталь Іосіфавіч НЯВЕРА. Тэл. 8 015 273 56 44;

• намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Сяргей Мікалаевіч МАСЛАЎ. Тэл. 8 022 250 18 69;

• кіраўнік спраў Мінскага аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ГУРЫНОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

• старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір Яўгенавіч КУХАРАЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.

# ПАЛІТЫКА РАЗВІЦЦЯ

**Вызначаць рэзервы для развіцця краіны неабходна з улікам памылак і няўдалых рашэнняў. Такім меркаваннем з журналістамі падзяліўся кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА, каментуючы пасяджэнне Магілёўскага аблвыканкама па выніках сацыяльна-эканамічнага развіцця вобласці за 2020 год.**



Фота БелТА.

«Магілёўская вобласць летась спрацавала па многіх параметрах значна лепш, чым у 2019-м. Нягледзячы на ўсе складанасці, вобласць развівалася, будавала, у тым ліку і жыллё, — адзначыў Ігар Сергеенка. — Сёння на пасяджэнні аблвыканкама былі адзначаны пункты росту і на бягучы год. Вызначаць рэзервы развіцця рэгіёнаў і краіны ў цэлым неабходна з улікам памылак і няўдалых рашэнняў. І сёння на пасяджэнні мы правялі сур'ёзны аналітычны разбор гэтых аспектаў».

Пасля ўдзелу ў пасяджэнні Магілёўскага аблвыканкама Ігар Сергеенка наведаў ААТ «Магілёўліфтмаш», дзе азнаёміўся з вытворчасцю, падзяліўся сваімі ўражаннямі ад VI Усебеларускага народнага сходу і адказаў на пытанні работнікаў.

«Сустрэчы па выніках УНС зараз праводзяцца ва ўсіх рэгіёнах. І іх праводзяць людзі, якія бралі непасрэдны ўдзел у рабоце Усебеларускага народнага сходу. І трэба не проста расказваць або даводзіць да ведама інфармацыю, але і нацэльваць калектывы на вырашэнне тых ці іншых задач, атрымліваць зваротную сувязь і бачыць праблемы, якія хвалююць, і знаходзіць для іх шляхі вырашэння, улічваючы меркаванне грамадзян, — адзначыў Ігар Сергеенка. — Сённяшняя сустрэча паказала, што людзей цікавяць розныя пытанні. Работнікі задавалі пытанні і па далейшай знешнеэканамічнай дзейнасці краіны. Дадзенае прадпрыемства — прыклад работы з замежнымі партнёрамі, у першую чаргу з Расійскай Федэрацыяй. Значная частка прадукцыі рэалізоўваецца ў Расію і іншыя краіны СНД. Хвалюе людзей жыллёвая палітыка, якія змяненні будуць у выбарчым заканадаўстве, якая палітыка будзе ў дзяржавы ў адносінах да бізнесу. Вельмі рознапланавыя былі пытанні, таму мы пастараліся пабудаваць нашы зносіны не ў фармаце лекцыі, а ў форме гутаркі».

Як адзначыў Ігар Сергеенка, у бягучай пяцігодцы асаблівую ўвагу будуць аддаваць развіццю рэгіянальнай палітыкі. «Дадзенае прадпрыемства — прыклад таго, як неабходна працаваць, развіваць эканоміку краіны і свайго рэгіёна. У Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця асаблівае месца аддаецца рэгіянальнай палітыцы — развіццю абласцей, буйных гарадоў, раённых цэнтраў і гарадоў-спадарожнікаў. Пастаўлена задача знаходзіць і рэалізоўваць у кожным раённым цэнтры інвестыцыйныя праекты, якія маглі б стаць драйверамі эканамічнага росту таго ці іншага рэгіёна. Развіццю сеткі мясцовых дарог таксама будзе ўдзелена асаблівая ўвага. Усе буйныя трасы, якія звязваюць абласныя цэнтры са сталіцай, пабудаваны, таму акцэнт будзе перамешчаны менавіта на дарогі абласнога значэння. Гэта будзе сур'ёзная і адказная работа ў кожным рэгіёне нашай краіны».

**Паводле БелТА.**

# АДПАВЯДАЦЬ СТАТУСУ

## Лідская бальніца атрымала новае абсталяванне

**Учора ў Лідскай цэнтральнай раённай бальніцы ўрачыста адкрыўся кабінет камп'ютарнай тамаграфіі. У бліжэйшыя два гады плануецца давесці аснашчэнне бальніцы ў Лідзе да статусу апорнай клінікі — з КТ, МРТ, аперацыйным і дыягнастычным абсталяваннем, паведамілі ў прэс-службе Міністэрства аховы здароўя.**



— Пандэмія выразна паказала, што развітая сістэма аховы здароўя — залог бяспекі любой краіны. Наша сістэма спраўляецца з выклікамі часу, але ўстаноўка такой тэхнікі, безумоўна дапаможа выконваць правіла «залатой гадзіны», — адзначыў **губернатар Гродзенскай вобласці Уладзімір КАРАНІК.**

Ён нагадаў, што праграма па стварэнні апорных клінік была прынята нядаўна. Яны мусяць быць аснашчаны апаратамі КТ, МРТ, ангіяграфіі і іншым абсталяваннем. Гэта дазволіць аказваць сучасную медыцынскую дапамогу, калі хворы дастаўляецца ў бальніцу на працягу гадзіны з моманту сардэчна-сасудзістай катастрофы.

Па словах **намесніка міністра аховы здароўя Барыса АНДРАСЮКА,** абсталяванне, якое ўстаноўлена ў Лідзе, набыта за кошт пазыкі Міжнароднага банка рэканструкцыі і развіцця ў мэтах барацьбы з COVID-19. Гэта адзін з 13 КТ-апаратаў на 64 зрэзы, закупленых для Беларусі па дадзенай праграме. Крыху пазней у Беларусь прыбудуць яшчэ 12 камп'ютарных тамографаў на 128 зрэзаў.

У найбліжэйшы час у Лідскай бальніцы завершаць рэканструкцыю хірургічнага корпуса, а пасля пачнецца будаўніцтва новага васьміпавярхowага тэрапеўтычнага корпуса, адзначыў Уладзімір Каранік.

— Для Ліды новы КТ-кабінет, адкрыты сёння, — пачатак вялікага шляху. У планах — набыццё для Лідскай ЦРБ магнітна-рэзананснага тамографа. За год-два мы плануем давесці аснашчэнне бальніцы ў Лідзе да статусу апорнай клінікі з апаратамі КТ і МРТ, аперацыйным і дыягнастычным абсталяваннем, што дазволіць падняць якасць аказання меддапамогі на новы ўзровень», — адзначыў Уладзімір Каранік.

**Алена КРАВЕЦ.**

Будзь у курсе

# Яшчэ раз аб ільготах

## Для пенсіянераў стаўка транспартнага падатку памяншаецца ў два разы

**Як вядома, з пачатку года ў нашай краіне ўведзены транспартны падатак, які фізічным асобам вылічваецца падатковым органам зыходзячы з устаноўленых ставак.**

**Стаўкі транспартнага падатку ўстанаўліваюцца ў залежнасці ад дазволенай максімальнай масы (напрыклад, легкавы або грузавы аўтамабіль), ёмістасці (напрыклад, аўтобус) або за адну адзінку транспартнага сродку (напрыклад, матацыкл) згодна з Дадаткам 27 Падатковага кодэкса (ПК).**

Пры гэтым, як адзначылі ў прэс-службе міністэрства, у выпадку адсутнасці звестак аб дазволенай максімальнай масе транспартнага сродку стаўкі транспартнага падатку ўстанаўліваюцца ў памеры мінімальнай стаўкі такога падатку для адпаведнага тыпу транспартнага сродку.

Разам з тым у Падатковым кодэксе **вызначана катэгорыя фізічных асоб, для якіх стаўка транспартнага падатку зніжана.**

Так, стаўка транспартнага падатку зніжаецца на 50 % у дачыненні да транспартных сродкаў, зарэгістраваных на ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, інвалідаў I або II групы, асоб, якія дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту, або асоб, якія маюць права на пенсію па ўзросце са зніжэннем агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту, а таксама на 25 % — у дачыненні да транспартных сродкаў, зарэгістраваных на інвалідаў III групы.

Права на зніжэнне стаўкі даецца толькі пры ўмове наяўнасці ў фізічнай асобы сапраўднага пасведчання кіроўцы адпаведнай катэгорыі.

Пры ўзнікненні ў плацельшчыка — фізічнай асобы права на прымяненне падатковай ільготы па транспартным падатку, у тым ліку ў выглядзе зніжэння падатковай стаўкі, ільгота дзейнічае з 1-га чысла месяца, у якім ўзнікла права на яе, а пры страце права на льготу выплата транспартнага падатку ажыццяўляецца з 1-га чысла месяца, наступнага за месяцам, у якім такое права страчана.

Акрамя таго, поўнае або частковае вызваленне ад аплаты транспартнага падатку маюць права атрымаць фізічныя асобы, якія знаходзяцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. Такое вызваленне даецца фізічным асобам мясцовымі Саветамі дэпутатаў або па іх даручэнні выканаўчымі і распарадчымі органамі.

Адзначым, што вызваленне ад выплаты транспартнага падатку магчымае толькі па транспартных сродках, якія не выкарыстоўваюцца пры ажыццяўленні прадпрымальніцкай дзейнасці.

Нагадваем, што транспартны падатак выплачваецца за кожны транспартны сродак, зарэгістраваны ў ДАІ МУС, на падставе паведамлення падатковага органа ўстаноўленай формы, якое штогод уручаецца такому плацельшчыку не пазней за 1 верасня года, наступнага за мінулым каляндарным годам.

Выплата транспартнага падатку плацельшчыкамі — фізічнымі асобамі ажыццяўляецца штогод не пазней за 15 лістапада года, наступнага за мінулым каляндарным годам.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Крымінал

# ДАПАМОГ З РАМОНТАМ КВАТЭРЫ...

## Мужчына ўкраў у пенсіянеркі амаль 7000 долараў

**Знікненне буйной сумы ў валюце выявіла 76-гадовая пенсіянерка з Віцебска. Жанчына выклікала міліцыю і распавяла, што грошы захоўваліся ў спецыяльнай скрыні. Там знаходзіліся два пачкі, у кожным з якіх ляжала па 10 тысяч. Адна з упаковак і была адкрыта невядомым злачынцам. Сышчыкам атрымалася вельмі хутка ўстанавіць асобу злодзея.**

Увагу аператыўнікаў прыцягнуў 50-гадовы аршанец, які дапамагаў пенсіянерцы з рамонтам кватэры. Жанчына паведаміла, што знайшла яго па рэкамендацыі знаёмых, і той у апошні час рэгулярна прыходзіў у кватэру. Акрамя таго, міліцыянерам удалося высветліць, што літаральна днямі мужчына, які да гэтага жыў у выпадковых знаёмых, набыў аўтамабіль BMW-X5, паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Віцебскага аблвыканкама.

У час размовы з праваахоўнікамі падазраваны прызнаўся, што сапраўды абакраў сваю працадаўцу. Таксама ён расказаў, што аўтамабіль — не адзіная пакупка на грошы пенсіянеркі. Мужчына паспеў купіць дарагое адзенне і некалькі аксесуараў для іншамаркі. Дарэчы, у апошняй ён і жыў увесь час пасля пакупкі. З усяго ўкрадзенага ў аршанца засталося толькі 400 долараў. Падазраваны затрыманы, распачата крымінальная справа.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Надвор'е

# А СОНЦА ГРЭЕ, ЯК ВЯСНОЙ

## У гэтыя выхадныя адліжнае цяпло злёгку спадзе, але ўсё роўна будзе да плюс 8 градусаў

**Вось ужо сапраўды: пачала павялічвацца працягласць дня — чакай вясновага надвор'я. І гэта нічога, што ў пачатку тыдня было кароткачасовае пахаладанне, было і прайшло...**

**А гэтымі днямі інтэнсіўна растае снег. За суткі ў многіх раёнах яго вышыня паменшылася на 2—6 сантыметраў. Паводле апошніх звестак, вышыня снегавога покрыва ў асноўным складае 1—29 см, у сталіцы — 23 см, на ўсходзе Магілёўскай вобласці яшчэ маюцца гурбы вышынёй 34—47 см. Гэта нічога, пару дзён зімы засталося, да таго ж цёплых, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння захаваецца адліжнае надвор'е, але адчуванне цяпла будзе прыглушаць заходні, паўднёва-заходні парывісты вецер. Максімальная тэмпература паветра будзе складаць 6—12 цяпла, у паўднёва-заходніх раёнах — да плюс 14 градусаў.

У выхадныя надвор'е нам сапсуе Балтыка. Так, у суботу і нядзелю на тэрыторыю нашай краіны «нагоніць» зусім няўстойлівую і халаднаватую паветраную масу, якая наступае з боку Балтыйскага мора. Будзе воблачна з праясненнямі. Месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаюцца слабыя туман і галалёд, на дарогах месцамі галалёдзіца. Вецер прагназуецца заходні, паўночна-заходні парывісты, у асобных раёнах моцны парывісты, а ў нядзелю вецер аслабее. У суботу тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 1 да плюс 4 градусаў, удзень — ад плюс 1 градуса на паўночным усходзе да 8 цяпла на паўднёвым захадзе краіны. У нядзелю ўначы будзе ад мінус 4 градусаў да 1 цяпла, удзень — ад нуля да 7 з плюсам.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у першых чыслах сакавіка цыклоны з актыўнымі франтальнымі часткамі будуць перамяшчацца далёка ад нашых граніц, таму ападкі чакаюцца толькі месцамі. Заходнія і паўночна-заходнія вятры працягнуць «пастаўляць» цёплае акіянічнае паветра, і ў многіх раёнах чакаецца перавага адліжнага надвор'я. У ранішнія гадзіны пры слабых адмоўных тэмпературах асобныя ўчасткі дарог усё ж будуць слізкія. Ранняя вясна, аднак...

**Сяргей КУРКАЧ.**

# «Адукацыя — гарант сацыяльнай стабільнасці ў грамадстве»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Чалавечы патэнцыял — менавіта той драйвер развіцця эканомікі, які непасрэдна залежыць ад адукацыі і які знаходзіцца ў фокусе нашай увагі. У сучасным свеце менавіта адукацыя з'яўляецца асноўнай умовай устойлівага развіцця дзяржавы і, як паказалі падзеі апошняга часу, гарантам сацыяльнай стабільнасці ў грамадстве.

Сёння ў Беларусі кожны можа рэалізаваць свае права на адукацыю для таго, каб быць паспяховым і запатрабаваным у грамадстве. І гэта не пустыя словы: кожны трэці жыхар нашай краіны вучыцца! Не ўсе дзяржавы могуць сабе гэта дазволіць. У нас на практыцы рэалізуецца найважнейшы прынцып — «адукацыя праз усё жыццё». Мы выбудоўваем сістэму адукацыі пад патрэбы эканомікі, падрыхтоўку адпаведных кадраў, інавацыйны шлях развіцця і лічбавую эканоміку.

Уражальныя вынікі былі атрыманы беларускімі падлеткамі па выніках іх удзелу ў праграме PISA-2018. У рэйтынгу чытацкай адукаванасці яны апынуліся на 36-й пазіцыі, у матэматычнай — на 38-й, а прыродазнаўча-навуковай — на 37-й. Усяго ў даследаванні ўдзельнічалі 79 краін і адміністрацыйна-эканамічных тэрыторый. А для беларускіх падлеткаў гэта быў першы вопыт удзелу ў міжнародным даследаванні, прычым паспяховы.

Сусветным банкам Беларусі быў прысвоены рэйтынг у Індэксе чалавечага капіталу — 36-е месца сярод 174 краін. Індэкс склаў 0,7. Гэта вышэй за сярэдні паказчык для рэгіёна Еўропы, Цэнтральнай Азіі і краін з узроўнем даходу, вышэйшым за сярэдні. Для параўнання — такі ж індэкс у ЗША.

Аб прэстыжнасці і якасці беларускай адукацыі сведчыць і рост экспарту адукацыйных паслуг. У нашых установах навучаецца каля 27 тысяч замежных грамадзян са 109 краін. Разам з тым задач, якія стаяць перад сістэмай адукацыі і патрабуюць вырашэння, яшчэ досыць шмат. Яны закранаюць усе кампаненты, узроўні і ступені адукацыі.

## УРОК АФЛАЙН І АНЛАЙН

***— Ігар Васільевіч, мінулы год стаў годам выпрабаванняў і праверкі на трываласць для ўсіх, у тым ліку і для сістэмы адукацыі. Чацвёртая вучэбная чвэрць знаходзілася пад пагрозай зрыву. Гучалі прапановы абвясціць аб заўчасным заканчэнні навучальнага года для ўсіх, акрамя навучэнцаў выпускных класаў. У педагогаў узніклі праблемы з атэстацыяй дзяцей, якія не наведвалі навучальныя ўстановы. Не ўсе настаўнікі і выкладчыкі маглі арганізаваць навучальны працэс у дыстанцыйным рэжыме. Ці былі зроблены з усяго гэтага нейкія высновы?***

— Давайце прызнаем, што нягледзячы на крытыку, якая гучыць часам у адрас нацыянальнай сістэмы адукацыі, яна працуе стабільна. Ва ўмовах напружанай эпідэмічнай сітуацыі без гадавых адзнак не застаўся ніхто. Выпускныя экзамены прайшлі ў звычайным рэжыме. А ўступная кампанія ў вышэйшых навучальных установах хоць і пасунулася нязначна па часе, тым не менш завяршылася паспяхова. У супрацоўніцтве з Міністэрствам аховы здароўя быў прыкладзены максімум намаганняў для таго, каб школы і дзіцячыя садкі заставаліся адкрытыя, а адукацыйны працэс не перарываўся. Праблемы, што ўзнікалі, мы вырашалі кропкава. І час паказаў правільнасць абранага намі шляху. Паводле інфармацыі ЮНІСЕФ, ад закрыцця школ пацярпела 90 працэнтаў вучняў па ўсім свеце. А ў Беларусі было забяспечана права выпускнікоў атрымаць атэстаты сталасці і ўступіць у дарослае жыццё.

Але пэўныя высновы, канешне, былі зроблены. Для папярэджання непрадказальных сітуацый у будучыні на аснове вывучэння вопыту суседніх краін і ўласных распрацовак мы стварылі сваю адукацыйную платформу для індывідуальнага навучання — Адзіны інфармацыйна-адукацыйны рэсурс. З 1 студзеня яна працуе ў тэставым рэжыме. Платформа не замяняе класна-ўрочную сістэму, а дапаўняе яе. Да яе можна звяртацца ў выпадку адсутнасці асобных вучняў, а таксама пры правядзенні заняткаў у аддаленым рэжыме для ўсяго класа. І, што важна, — вучань незалежны ад інтэрнэту! Атрымаўшы матэрыял на флэшцы, ён можа працаваць у зручны для яго час, напрыклад, калі вызваліцца дамашні камп'ютар, бо калі ў сям'і некалькі дзяцей школьнага ўзросту, узнікае пытанне, як ім усім займацца ў анлайн-рэжыме? Гэта каштоўна таксама для дзяцей работнікаў пасольстваў за мяжой, дзе часта няма рускамоўных школ, асабліва пры засваенні вучэбных праграм па беларускай мове і літаратуры і гісторыі Беларусі.

Навучальныя матэрыялы для платформы распрацоўваюцца з улікам узроставых асаблівасцяў вучняў, неабходнасці ўключэння іх у практычную дзейнасць, дазваляюць арганізаваць асноўныя этапы працэсу навучання (ад тлумачэння матэрыялу да яго замацавання і кантролю). Сабраны вопыт найлепшых настаўнікаў, якія самі асвоілі розныя праграмы, вывучылі методыку анлайн-урока, запісалі і адрэдагавалі матэрыял. Няхай кантэнт пакуль яшчэ не зусім дасканалы, але ён будзе пастаянна паляпшацца. Змест матэрыялаў платформы ўжо цяпер карысны маладым спецыялістам у плане павышэння іх прафесійнай кампетэнтнасці і вывучэння вопыту старэйшых калег. Адзіны інфармацыйна-адукацыйны рэсурс падтрымліваецца Нацыянальным інстытутам адукацыі і Галоўным інфармацыйна-аналітычным цэнтрам Міністэрства адукацыі. Дарэчы, «прагнозы», што ён не вытрымае нагрузку, калі ўсе адначасова ўвойдуць на яго, не спраўдзіліся. Платформа працуе стабільна...

## КАБ РАЗГРУЗІЦЬ СТАРШАКЛАСНІКАЎ

***— Ёсць меркаванне, што той аб'ём ведаў, які даюць у школе, проста немагчыма ўпіхнуць у галаву. Адсюль і праблемы з перагружанасцю школьнікаў. Не сакрэт, што старшакласнікі не могуць ахапіць усё, таму канцэнтруюць сваю ўвагу толькі на некалькіх школьных прадметах, якія ім давядзецца здаваць пры паступленні...***

— У сістэме агульнай сярэдняй адукацыі зараз завяршаецца абнаўленне зместу: поўны пераход на новыя навучальныя праграмы, уключаючы базавы і павышаны ўзроўні вывучэння вучэбных прадметаў, адбудзецца ў наступным навучальным годзе.

А з гэтага навучальнага года ў рамках эксперыментальнага праекта ў 34 установах адукацыі апрабуюцца розныя варыянты ўдасканалення навучальных планаў і праграм, увядзенне інтэграваных навучальных курсаў. У тым ліку ў кантэксце падыходаў, што рэалізуюцца ў міжнародным даследаванні PISA. У цэлым, апрабуемыя тэхналогіі даюць магчымасць навучэнцам сканцэнтраваць намаганні на вывучэнні профільных прадметаў, сэканоміўшы сілы і час на вывучэнні няпрофільных, выпрацаваць індывідуальную траекторыю навучання кожнага вучня. Пры гэтым істотна скарачаецца колькасць абавязковых прадметаў, якія вывучаюцца адначасова, кампактна фарміруюцца невялікія па аб'ёме навучальныя курсы. Прадметы, на вывучэнне якіх адводзіцца, напрыклад, адна гадзіна ў тыдзень на працягу двух гадоў, лепш засвойваць на працягу аднаго вучэбнага года, калі заняткі праводзяцца па дзве гадзіны ў тыдзень. Такім чынам можна палепшыць засваенне матэрыялу, пры гэтым навучэнцы змогуць сканцэнтраваць свае намаганні на паглыбленні ў профільныя прадметы.

Сёння ў нас створана сур'ёзная база для арганізацыі профільнага навучання. Дзейнічае вялікая колькасць класаў эканамічнай і гуманітарнай скіраванасці. Між іншым, існуе патрэба ў класах фізіка-матэматычнай, хімія-матэматычнай, хімія-біялагічнай і інфарматыка-матэматычнай скіраванасці. Лічу, што профільныя класы павінны фарміравацца не толькі выходзячы з пажаданняў бацькоў і навучэнцаў, як гэта часта адбываецца, а ў першую чаргу пад спецыяльнасці, запатрабаваныя рэальным сектарам эканомікі канкрэтнага рэгіёна. Профільнае навучанне павінна матываваць вучняў на атрыманне тых прафесій, якія запатрабаваны на рынку працы. Ідучы ў профільны дзясяты клас, вучань ужо павінен ведаць сваю адукацыйную траекторыю пасля заканчэння сярэдняй школы. Для гэтага органы мясцовай выканаўчай улады павінны стварыць аптымальную адукацыйную сетку ў сваіх раёнах.

У краіне адкрыты класы педагагічнай, аграрнай, спартыўна-педагагічнай і ваенна-патрыятычнай скіраванасці. Значны крок зроблены ў развіцці дапрафесійнай падрыхтоўкі і прафесійнага навучання. Для навучэнцаў базавых 10—11 класаў у рамках працоўнага навучання рэалізуецца адукацыйная праграма прафесійнай падрыхтоўкі рабочых. Пералік прафесій уключае ўжо больш як 100 пазіцый. Па завяршэнні навучання даецца магчымасць здаць кваліфікацыйны экзамен. Лічу, што ў будучыні кваліфікацыйны экзамен павінен стаць абавязковым для ўсіх навучэнцаў базавых класаў. Зараз у гэтым кірунку трэба праводзіць тлумачальную, прафарыентацыйную работу з вучнямі і іх бацькамі. І, што важна, — распрацаваць праграмы, інтэграваныя з праграмамі прафесійна-тэхнічнага і сярэдняга спецыяльнага навучання. Для таго каб, атрымаўшы ў школе асновы прафесіі, чалавек мог у больш кароткія тэрміны прайсці навучанне і атрымаць дыплом.



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

***— Ігар Васільевіч, а калі мы дачакаемся ўвядзення незалежнай атэстацыі на выхадзе са школы?***

— Нюансы новага механізму правядзення выніковай атэстацыі выпускнікоў усё яшчэ абмяркоўваюцца, але асноўная сутнасць змен — у скарачэнні нагрузкі на выпускнікоў за кошт сумяшчэння выпускных і ўступных іспытаў. Даныя правядзенага незалежнага даследавання паказалі, што больш за 65 працэнтаў апытаных бацькоў, настаўнікаў і саміх вучняў падтрымліваюць такі падыход.

Намі таксама было прапанавана выстаўляць у атэстат толькі тую адзнаку, якая будзе атрымана па выніках здачы Нацыянальнага экзамену. Гэта значыць, аб'ектыўную, рэальную, як кажуць, не «нацягнутую», і вось тут мы сустрэлі супраціўленне. Прычым у найбольшай ступені ад настаўнікаў, якія кажуць: «Не хочам толькі адзнаку за Нацыянальны экзамен. Давайце сярэднюю, з улікам гадавой адзнакі па прадмеце». А чаму? Каб схаваць слабую падрыхтоўку вучня, а, значыць, і дрэнную работу самога настаўніка? А можа, каб была магчымасць завышаць асобным вучням балы ў атэстаце, нівеліруючы «ліпавай» гадавой адзнакай аб'ектыўны вынік незалежнага экзамену? Але так мы якасць школьнай адукацыі ніколі не палепшым. І не трэба хавацца за выхаваўчай і стымулюючай функцыяй ацэнкі. Гэтыя функцыі павінны рэалізоўвацца ў бягучай атэстацыі, а не ў выніковай.

З улікам неабходнасці апрабацыі новай мадэлі, унясення змяненняў у нарматыўныя акты, правядзення інфармацыйна-растлумачальнай работы, падрыхтоўкі саміх настаўнікаў лічым найбольш апраўданым рэалізаваць новыя падыходы пасля іх дбайнай прапрацоўкі, даўшы час на іх метадычную адаптацыю.

Таксама плануецца ўдасканаленне правілаў прыёму ў ВНУ і каледжы з такім разлікам, каб ацэньваць не толькі пададзеныя ў прыёмную камісію балы і лічбы, але перш за ўсё чалавека, яго індывідуальныя якасці і здольнасці. Пры гэтым захаваюцца прынцыпы празрыстасці і справядлівасці пры правядзенні ўступных іспытаў і залічэнні.

## АСАБІСТЫ ПРЫКЛАД

***— На выніковай калегіі свайго ведамства вы сказалі, што школа, ліцэй, каледж, універсітэт — не пляцоўкі для палітычных баталій. Сістэма адукацыі — не бізнес-асяроддзе і не сфера паслуг, а інстытут сацыялізацыі моладзі, які забяспечвае выхаванне асобы, фарміруе яе светапогляд і шырокую эрудыцыю...***

— Эфектыўнасць вырашэння выхаваўчых задач, якія стаяць перад намі, залежыць ад многіх фактараў, перш за ўсё, ад мэтанакіраванага адбору зместу вучэбнага матэрыялу, узораў сапраўднай маральнасці і духоўнасці, грамадзянскасці і патрыятызму, якія выкарыстоўваюцца педагогам на ўроках, а, значыць, ад яго прафесіяналізму. Кожны школьны прадмет, кожная ўніверсітэцкая дысцыпліна аказваюць значны ўплыў на фарміраванне светапогляду дзяцей і моладзі, але найбольш моцнае — сацыяльна-гуманітарныя дысцыпліны.

Жнівеньскія падзеі паказалі, наколькі важна не дапусціць уплыву дэструктыўных сіл на неакрэплыя маладыя розумы, зберагчы іх ад пратэсных заклікаў да дэстабілізацыі ў грамадстве, ад удзелу ў антыдзяржаўных акцыях. Таму разам з традыцыйнымі патрабуюцца новыя падыходы да выхаваўчай работы. Задача ў тым, каб аб'яднаць разрозненыя ініцыятывы ў цэласную сістэму, дасягнуць адзінства ўсіх сацыяльных інстытутаў (школы, сям'і і грамадскасці) у пытаннях выхавання.

Для каардынацыі дзейнасці розных структур ствараецца Рэспубліканскі маладзёжны цэнтр, які будзе забяспечваць работу з моладдзю праз падтрымку дзейнасці студэнцкага самакіравання, маладзёжных грамадскіх аб'яднанняў пры шырокім інфармацыйным суправаджэнні дадзенай работы.

Да актыўных формаў работы падключылася студэнцкая і працоўная моладзь. Па іх ініцыятыве былі створаны дыскусійныя пляцоўкі, клубы выпускнікоў. У 2020 годзе на дыялогавых пляцоўках у рэгіёнах прайшло шырокае абмеркаванне пытанняў удасканалення работы з моладдзю, абмеркаванне Стратэгіі маладзёжнай палітыкі. Новай формай арганізацыі выхаваўчай работы стаў адкрыты дыстанцыйны марафон праектаў «Мы дзейнічаем!». Для яго рэалізацыі

на Нацыянальным адукацыйным партале адкрыта інтэрнэт-пляцоўка для ўзаемадзеяння ўсіх удзельнікаў праекта «ШАГ» (Школа актыўнага грамадзяніна).

Сёння дзяржавай створаны неабходныя ўмовы для самарэалізацыі і развіцця маладых людзей. Але, як паказала практыка, патрабуюцца дадатковыя «сацыяльныя ліфты», новыя формы дыялогу ўлады і моладзі. У сувязі з гэтым у рэгіёнах актыўна развіваецца абласны і гарадскі маладзёжны парламенцкі рух. Летась быў створаны Маладзёжны парламент пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь.

Прапрацоўваецца таксама пытанне па пашырэнні формаў падтрымкі сацыяльна значных ініцыятыў моладзі. Адной з іх стане сістэма адкрытых конкурсаў і вылучэнне грантаў на рэалізацыю маладзёжных праектаў.

Зразумела, што сацыяльныя і асобасныя кампетэнцыі навучэнцаў і студэнтаў фарміруюцца перш за ўсё асабістым прыкладам настаўніка, выкладчыка і выхавальніка. Іх па звычцы лічаць асноўнымі носьбітамі ведаў, духоўных і культурных каштоўнасцяў. Але давайце прызнаем: сёння ў сістэму адукацыі прыходзіць зусім іншае пакаленне педагогаў. Нярэдка іх саміх прыходзіцца вучыць і ідэалам, і адказнасці за даручаную справу. Таму хацеў бы звярнуцца да мудрых і дасведчаных педагогаў, якія ёсць у кожнай установе адукацыі: вазьміце нашу маладую змену пад асаблівую апеку. Трэба адрадзіць традыцыі настаўніцтва ў педагагічных калектывах.

З выкарыстаннем інтэрнэт-рэсурсаў запланавана стварэнне адзінай інфармацыйнай інтэрактыўнай платформы па патрыятычным выхаванні, на якой будуць прадстаўлены нарматыўная база, метадычны матэрыял, найлепшы вопыт і найлепшыя практыкі.

Педагог павінен не толькі атрымліваць інфармацыю з сацыяльнай сеткі, а працаваць у ёй. Калі гэтага не будзе, то знойдуцца іншыя, чыё меркаванне для падлеткаў і маладых людзей стане вырашальным. На працягу года адкрылася шмат дэструктыўных анлайн-пляцовак, у тым ліку для педагагічнай, бацькоўскай і маладзёжнай аўдыторыі, асноўнай мэтай якіх з'яўляецца раскол педагагічнай супольнасці і ўцягванне яго прадстаўнікоў у дэструктыўную дзейнасць. На жаль, даводзіцца канстатаваць, што педагогі сёння недастаткова валодаюць вопытам работы ў сацсетках. І гэты прабел трэба тэрмінова ліквідаваць: Акадэмія паслядыпломнай адукацыі, РІПА, РІВШ, абласныя інстытуты развіцця адукацыі павінны арганізаваць навучанне класных кіраўнікоў, куратараў груп з наступным ахопам настаўнікаў-прадметнікаў, каб паказаць на практыцы, на што звяртаць увагу пры аналізе старонак дзяцей і моладзі, як арганізаваць работу з класам ці групай праз віртуальную суполку.

Сацыяльныя сеткі перастануць быць стыхійнай і некіруемай з'явай толькі ў тым выпадку, калі педагог будзе прыняты і запатрабаваны падлеткамі і моладдзю ў інтэрнэт-прасторы. Наогул жа да сацыяльных сетак трэба ставіцца не як да альтэрнатывы традыцыйнай сістэме выхавання, а як да яе працягу. Тут ёсць мноства нюансаў: недапушчальна, калі ва ўстанове адукацыі педагог кажа літаратурнай моваю, распавядае дзецям пра поспехі краіны, вучыць добраму і прыгожаму, а ў сеціве паводзіць сябе непрыстойна.

Хачу дадаць, што ў гэтым годзе плануецца таксама стварэнне Фонду маладзёжных ініцыятыў — інфармацыйнай сеткі ў інтэрнэце, праз якую моладзь будзе атрымліваць звесткі аб праектах і мерах дзяржаўнай падтрымкі.

Мяркую, правільна будзе падтрымаць ініцыятыву маладых людзей па арганізацыі інфармацыйнага цэнтра, задачамі якога стануць інтэграванне тэлеграм-каналаў, прасоўванне такіх інтэрнэт-рэсурсаў, як «Маладзёжны цягнік», «Настаўніцкая газета», стварэнне ў іх чатаў з мэтай зваротнай сувязі, абмеркавання надзённых праблем сістэмы адукацыі і ўнясення канструктыўных прапаноў.

Будуць ствараца інфармацыйныя пулы, куды ўвойдуць лідары грамадскіх меркаванняў, папулярныя блогеры, яркія прадстаўнікі педагагічнай супольнасці. Менавіта яны павінны стаць актыўнымі мадэратарамі анлайн- і афлайн-пляцовак.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# СТВАРАЛЬНЫ БІЗНЕС СЯРГЕЯ КУЦАНАВА

## ГРОШЫ РАБІЎ НА... СТАНКУ

У ліхія 90-я, калі ў звычайны лад жыцця савецкіх грамадзян увайшлі словы «рынак», «камерцыя», было ўсякае. Але ў адрозненне ад некаторых сваіх сяброў, якія пачалі ездзіць па тавары за мяжу і рабіць грошы за кошт «купі-прадай», Сяргей набыў сабе былы ва ўжыванні станок, запрасіў некалькіх работнікаў і запусціў дрэваапрацоўчую вытворчасць. Вопыт работы з дрэвам быў — пасля арміі ўжо паспеў папрацаваць на «шабашках» і нават паспрабаваць сябе ў якасці брыгадзіра. А яшчэ было добрае веданне рынку — у той жа Расіі ў пачатку нулявых на ўра ішлі міжпакаёвыя дзверы з натуральнага дрэва. Першы так званы «цэх» па іх вытворчасці ён будаваў разам з таварышамі на ўчастку сваіх бацькоў. Тыя, хоць і не вельмі ахвотна, але пагадзіліся выдзеліць кавалак зямлі каля свайго дома. Бо бачылі, што сын стараецца. Усё, што стваралася на станку Сяргея Куцанава, ішло на экспарт.

— Зароблены грошы ўкладваліся выключна ў развіццё, — згадвае ён той перыяд. — Паступова павялічвалася вытворчая база, станочны парк, нарошчваліся аб'ёмы і рос прыбытак. Для таго каб стаць на ногі, спатрэбілася некалькі гадоў. Я добра памятаю, якія шалёныя грошы зараблялі на перапродажы замежных тавараў мае знаёмыя. Яны і мяне клікалі гандляваць тапачкамі. А я ўсё ніяк не мог сцяміць: чаму тое, што заўсёды называлася спекуляцыяй, раптоўна пачалі лічыць бізнесам? Людзі нічога не ўкладалі ў справу, проста багацелі за кошт перапродажу. У мяне бацька — ветэран вайны, камандзір партызанскага атрада. Маці ўсё жыццё працавала ў школе. Я быў выхаваны на тым, што трэба сваёй справай прыносіць карысць. І гэта было прынцыпова. Працаваў на сумленне. Для таго каб не купляць гатовыя дошкі, патрэбна была піларама. Назбіраў грошай і пабудаваў яе. У месяц яна дазваляла пілаваць тысячу кубоў драўніны. І каб загрузіць станкі, трэба было вазіць лес. Прыйшлося купляць лесавозы, арганізоўваць брыгады, якія займаліся нарыхтоўкай. Так мой бізнес вырас да 120 чалавек. Быў і такі перыяд у маёй справе. Зараз абмяжоўваюся 12 работнікамі, якія сумяшчаюць некалькі прафесій.

## САМ САБЕ ІНВЕСТАР

Калі будзеце ў Сідаравічах, абавязкова наведайце вуліцу Рачную, што працягнулася ўздоўж маленькай рачулкі з прыгожай назвай Лазняўка. Сімпатычныя катэджы, якія вы там убачыце, пабудаваныя менавіта Сяргеем Куцанавым і яго аднадумцамі.

— Гэта зараз я селянін, а да 2014 года быў гараджанінам, — усміхаецца Сяргей. — Калі наступіў чарговы крызіс, мы з жонкай вырашылі пабудаваць на маёй малой радзіме дачу. На той час мы ўжо займаліся вытворчасцю драўляных зрубаў. Яшчэ некалькі маіх знаёмых захацелі скласці кампанію. І я стаў распрацоўваць генеральны план. Усе рабіў выключна сам. Адзіная мая ўмова была, каб усе дамы мелі аднолькавы выгляд. Я ўжо нагледзеўся розных катэджных пасёлкаў і добра ведаў, якая бязгluздзіца можа там сустракацца. Кошт квадратнага метра такога жылля на той момант складаў ад 350 да 500 долараў. Для параўнання: у гарадской кватэры ён каштаваў 1000—1500 долараў. Мы ж рабілі ўсё «пад ключ». Калі пачалі шукаць праектантаў, зразумелі, што спецыялістаў, якія маюць справу з дрэвам, у Магілёве няма. Праект нам распрацоўваў віцябнянін, малады чалавек, які па першай адукацыі быў мастак, а па другой — архітэктар.

Дамы будаваліся з усімі выгодамі і камунікацыямі. На першым паверсе лазня, вялікі спальны пакой, прасторная кухня, сумешчаная з гасцінай і з выхадам на тэрасу. Дамы каштавалі на той момант 70—80 тысяч долараў. Улічваючы іх памеры — 180 квадратаў, цана не такая і высокая. Усяго іх было пабудавана шэсць — пяць чалавек пераехалі туды жыць з Магілёва, а адзін нават з Масквы.

— Дзесьці нам перашкодзіў каранавірус, — прызнаецца Сяргей. — Я прасоўваю свае дамы праз сацсеткі і бачу, што попыт на іх расце. Два гады таму моладзь купляла іх пад крэдыты. Калі б на вёсцы было дзе працаваць, знайшліся б ахвотныя пераехаць. Нават такая мікраарганізацыя з 15 чалавек, як мая, — вялікая справа. З улікам іх сем'яў гэта ўжо нямала. Такіх бы пяць арганізацый — і 200 чалавек забяспечаны даходамі. Каб маленькі населены пункт існаваў паўнавартасна, у ім павінна жыць чалавек 500—1000 як мінімум. Тады будзе і школа, і ФАП, і ўсё астатняе.



Падзякі за якасць і інавацыйны падыход.



Зрубы Сяргея КУЦАНАВА карыстаюцца попытам і ў Беларусі, і ў Расіі.

## БУДУЧАЕ ЗА ВЫТВОРЦАМІ

Менавіта на іх робіць стаўку дзяржава. Сяргей Куцанаў падтрымлівае гэта рашэнне, бо па сабе ведае, што гэта такое.

— У мяне тут усё на паверхні, прыязджай і чытай. Усё ўкладзена сюды, — кажа ён, дэманструючы сваю дрэваапрацоўчую гаспадарку. — Магчыма, звонку яна і несамавітая, але ўнутры напхана абсталяваннем, якое дае магчымасць ствараць годную прадукцыю еўрапейскай якасці. Робім зрубы па нарвежскай і канадскай тэхналогіі, кухонную мэблю, аконныя блокі, міжпакаёвыя і ўваходныя дзверы. Апошнія, дарэчы, па сваёй трываласці нічым не саступаюць стальным. І гэта пры тым, што зроблены з натуральнага дрэва. Экалагічна чысты прадукт.

За больш чым 20 гадоў работы на сябе Куцанаў зразумеў, што бізнес павінен быць гнуткі. Грошы трэба ўкладваць у розныя галіны, тады больш шанцаў не пачынаць усё з нуля.

— Самае галоўнае, каб былі зразумелыя правілы гульні, — разважае ён. — Сказалі, што прыватнікам лесу не дадуць, усё пойдзе дзяржструктурам, і гэта нармальна. Я знайду свой шлях. У мяне яшчэ ў запасе некалькі кірункаў — рыбгас, ягады. Навошта я гэта раблю? Таму што ведаю: рана або позна работа з сыравінай становіцца прэрагатывай дзяржавы, і нам яе можа не хапіць. Трэба падшукваць нешта такое, каб самому ствараць сыравіну і перапрацоўваць яе ў канчатковы прадукт.

Вырошчваннем рыбы прадпрымальнік займаецца з 2009 года. У яго распараджэнні 10 азёраў — 150 гектараў воднай гладзі. Рыбаводства — справа тонкая. Пакуль вырасце таварная рыба з лічынкі, патрэбна тры гады. Сяргей такім чынам вырошчвае карпа і шчупака. Свежы тавар цалкам рэалізуецца «з колаў» у Магілёве. Больш цеплалюбівыя амур і таўсталобік завозяцца з Брэсцкай вобласці.

А летась прадпрымальнік вырашыў паспрабаваць зусім новую для сябе справу — вырошчванне дурніц.

— На гэтую ідэю мяне натхнікі песімізм, — усміхаецца ён. — 10 гектараў зямлі для фермерскай гаспадаркі — гэта ні пра што, займацца клубніцамі або гароднінай — не маё. А да дурніц я ўжо гады 2-3 прыглядаюся. Яны вельмі цяжка прыжываюцца, але я заўсёды лезу туды, дзе складана канкурэнтам. Для дурніц патрэбна спецыяльная кіслотнасць глебы, а гэта павінен быць спецыяльны торф. У нас у Беларусі дурніц хапае, але, як паказвае аналіз, у свеце гэтай ягады вырошчваецца толькі 10 % ад патрэб. Расія, напрыклад, з вялікім задавальненнем яе набывае. Ягада вельмі карысная, шмат дзе прымяняецца.

## НЯХАЙ ГОРШ, АЛЕ Ж СВАЁ

Сяргей Куцанаў не толькі вытворца, ён яшчэ і народны выбраннік. І нават прадстаўляў свой раён на Усебеларускім народным сходзе. Ён за тое, каб развіваць невялікія населеныя пункты і ствараць там умовы для жыцця. А яшчэ пераканаы ў тым, што наша будучыня залежыць толькі ад нас саміх, і яе трэба ствараць сваімі рукамі, не спадзеючыся на дапамогу звонку.

— Што такое гаспадар? — разважае ён. — Вось мы жылі ў СССР, нешта там было дрэнна, нешта добра. Калі ўпершыню пабываў у Польшчы, зайздросціў, якія ў іх прыгожыя машыны, як добра яны жывуць. Але ніколі не ўнікаў у рэаліі, колькі каштуе іх жыццё. Ведаў, што яны зарабляюць па 2-3 тысячы еўра, затое разумею частку не ўяўляю. Гэта я потым зразумеў, што ўсё прыгожае належыць манапалісту, а не сярэдняму бізнесу. Чалавеку, у якога мільярды, нічога не перашкаджае ўсё скупіць і стаць манапалістам. Таму я прыхільнік таго, што няхай горш, але ж сваё. Трактары, якія былі ў нас 30 гадоў таму і зараз, не параўнаць. Яны не адрозніваюцца ад імпартных аналагаў. Засталося крыху рухавік дарабіць — і будзе ўсё, як трэба. Для гэтага і неабходна канкураваць, развівацца. Ну, запусці ў краіну замежніка — яму нашы вытворчасці і дарам не патрэбныя. Яму патрэбны нашы землі і рабочая сіла. Таму я, як гаспадар, за тое, каб захоўваць усё і мець больш свайго. Калі ў мяне ёсць трактарок, няхай ён «не фантан», але я ім чышчу вуліцы. Я ніколі не чакаю каманды зверху. Завеяла снегам дарогі — я выклікаю людзей, і мы іх «прабілі». Не чакаем ЖКГ, таму што не ўсё там так добра. Я ж як дэпутат райсавета павінен клапаціцца пра народ. І шчыра скажу як дэлегат сходу. Заходнія прапагандысты спрабавалі прызнаць нас нелегітымнымі, але яны моцна памыляюцца. Народ жа выбраў нас дэпутатамі, ён нам давярае, і мы прадстаўлялі на сходзе менавіта яго інтарэсы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

*Магілёўскі раён.*

**Фота аўтара.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# АДНЫ НА ТРЫ ДАМЫ



## Чаму з аварыйнага жылля пажылыя людзі не могуць пераехаць у нармальнае

**Паняцце «дом» для чалавека мае мноства важных сэнсаў. Гэта дах над галавой, прытулак, абарона ад непагадзі і бур. Гэта сімвал сям'і і ціхая гавань напрыканцы жыцця. Але што рабіць, калі твой дом болей не здольны атуліць і абагрэць, а пераезд у новае жыллё ператварыўся ў мару, якая здаецца недасяжнай?**



Дом на Валгаградскай, дзе засталася толькі адна сям'я.

«Перад людзьмі сорамна, што жывём у такіх умовах», — кажа Ларыса Аркадзеўна Кудзіна, гаспадыня адзінай кватэры, якая засталася жылой у трох аварыйных дамах на вуліцы Валгаградскай у Мінску.

Апошнія жыхары выехалі адсюль яшчэ летась. Усе, акрамя Кудзіных — да гэтага часу яны не атрымалі жыллё наўзамен таго, што ідзе пад знос. Пенсіянерка расказвае, што іх дом, нумар 76 па Валгаградскай, і яшчэ два дамы паблізу былі прызнаныя аварыйнымі яшчэ ў нулявых.

— Года не памятаю, але гадоў 15 гэтыя дамы ўжо лічацца аварыйнымі, — згадвае Ларыса Кудзіна.

Ларыса Аркадзеўна ў Мінск прыехала ў 1969-м, а ў гэты дом засялілася ў 1974-м. Усё жыццё жанчына прапрацавала на тэлефоннай станцыі. Яе муж Мікалай Васілевіч — у мінулым вайсковец — карэнны мінчанін. Спачатку, расказвае наша гераіня, сям'я жыла ў паўпадвальнай кватэры на вуліцы Кузьмы Чорнага. Калі тое пайшло пад знос, пераехалі на вуліцу Валгаградскую, у адзін з трох старых дамоў недалёка ад Севастопальскага парку.

— Нам тады казалі: на дзесяць гадоў, а потым дамы будуць рассяляцца і мы атрымаем добраўпарадкаванае жыллё. А аказалася — ледзь не назаўсёды... Нам з мужам па 71 годзе, што мы можам?.. Вось пішам і пішам лісты, а з мяне які пісьменнік?.. Нам адказваюць: чакайце. Ну што ж, чакаем!

Кватэра Кудзіных магла б быць утульнай: відаць, што Ларыса Аркадзеўна — добрая гаспадыня. Яна і цяпер спрабуе падтрымліваць які-ніякі парадак, але дом, у якім жыве сям'я, даўно выпрацаваў свой рэсурс. Шпалеры не трымаюцца на сценах, столь прасядае, на ёй плямы плесні. Старое тут усё: трубы, праводка, перакрыцці, вокны і дзвярныя праёмы.

— Чатыры гады таму мы змаглі прыватызаваць кватэру, — расказвае суразмоўніца. — Як той казаў, паспелі «ў апошні вагон». Зразумела, усю суму выплаціць адразу былі не ў сілах, выплачваем да гэтага часу. Так і жывём. Грошай хапае плаціць прыватызацыю і камуналку. Муж Мікалай не ўстае з ложка — у яго анкалагічнае захворванне. Але камунальныя плацяжы мы заўсёды плацім своечасова. Ні разу ў маім жыцці запазычанасці па камуналцы ў мяне не было.

— Мала таго, што сям'я жыве ў непрыдатных для жыцця ўмовах. З-за адной сям'і ацяпляюцца ўсе тры дамы — у іх агульная ацяпляльная сістэма, — кажа сяброўка Ларысы Аркадзеўны, Таццяна.

Дарэчы, пра сітуацыю, у якую трапіла сям'я Кудзіных, рэдакцыі «Звязды» стала вядома менавіта ад яе. Самі Кудзіны наўрад ці звярнуліся б у газету — няёмка неяк. Але пагаварыць аб сваёй сітуацыі пагадзіліся:

— Мы людзі не скандальныя, ніколі нікуды не звярталіся. Але тут ужо проста няма выйсця!

## «Толькі адзін раз адмовіліся»

У кастрычніку 2018 года прыйшла доўгачаканая афіцыйная папера: аварыйныя дамы па Валгаградскай будуць рассяляцца.

— У кастрычніку 2019 нам прапанавалі аднапакаёвую кватэру, — успамінае Ларыса Аркадзеўна. — Былі б мы з мужам толькі ўдваіх, мы б пагадзіліся. Але з намі яшчэ жыве дарослы сын. Анкалагічны хворы, я і сын — як мы будзем спаць у адным пакоі?

Тым больш, жанчына не губляе надзеі, што сын ажэніцца, уладкуе сваё жыццё, і, зразумела, маладой сям'і трэба будзе дзесьці жыць — не ў аднапакаёвай жа кватэры ім усім туліцца.

Словам, адмовіліся. Тут, у аварыйным доме, у Кудзіных кватэра двухпакаёвая — вырашылі на сямейным савеце, што і пераязджаць будуць у два пакоі.

— Мы толькі адзін раз адмовіліся, — кажа жанчына. — Суседзі нашы адмаўляліся па тры разы — і з'ехалі ў новае жыллё. А мы да гэтага часу тут.

У ліпені мінулага года быццам бы ўсё шчасліва вырашылася: двухпакаёвая кватэра ў Сцяпянцы спадабалася Кудзіным і яны далі згоду. Сталі чакаць дакументы на засяленне. Зімаваць спадзяваліся ўжо ў новым жыллі. Чакаюць і сёння. Прайшло сем месяцаў...

А тым часам з трох аварыйных дамоў выехалі ўсе іх суседзі. Зімовымі вечарамі стала неяк страшнавата, дарма што Валгаградская — практычна цэнтр Мінска. Тым больш што кватэры на першым паверсе аблюбавалі бяздомныя. Выбілі вокны і рассяліліся па апусцелых пакоях.

— Што ж, ім таксама трэба дзесьці жыць, — уздыхае Ларыса Аркадзеўна. — Але ж нам страшна, бо і спаліць дом могуць. Вядома, асобы без пэўнага месца жыхарства — не надта адказная публіка. А зрэшты, мы самі цяпер жывём амаль як яны...

Звярнуліся Кудзіны ў Мінгарвыканкам, напісалі ліст. Што ж, зараз усе вокны на першым паверсе іх дома забітыя фанерай. Але пенсіянеры чакалі не гэтага: яны хацелі жыць у кватэры, дзе пры позірку на столь і сцены не баішся, што яны ўпадуць табе на галаву.

## «Усе выехалі, мы засталіся»

Ларыса Кудзіна гартае дакументы.

У афіцыйным лісце ад 03.10.2018 КУДП «Упраўленне капітальнага будаўніцтва Цэнтральнага раёна г. Мінска» паведамляе, што рашэннем Мінгарвыканкама ад 20 верасня 2018 года для рэалізацыі праекта па будаўніцтве аб'екта «Шматкватэрныя жылыя дамы ў межах Лагойскага тракта, вул. Валгаградскай, Кнорына, Севастопальскай» дзяржаўнаму прадпрыемству УКБ Цэнтральнага раёна Мінска даручана рэалізаваць правы ўласнікаў нерухомай маёмасці, якая падлягае зносу, у тым ліку па адрасе, па якім пражываюць Кудзіны. І што яны маюць права на «атрыманне ва ўласнасць кватэры тыпавых спажывецкіх якасцяў», а таксама ў выпадку, калі рынкавы кошт кватэры, якая выдзяляецца, меншы, чым рынкавы кошт той, што падлягае зносу, — грашовай кампенсацыі ў памеры гэтай розніцы.

У дакуменце ад 07.07 мінулага года гаворыцца, што па рашэнні Мінгарвыканкама Кудзіну Мікалаю Васілевічу, Кудзіну Васілю Мікалаевічу і Кудзінай Ларысе Аркадзеўне (уласнікам 1/3 долі) выдзяляецца двухпакаёвая кватэра па вул. Карвата.

— Я з'ездзіла, паглядзела кватэру, мне ўсё спадабалася. Мы далі згоду, — кажа суразмоўніца.

Радасныя гаспадары сталі збіраць рэчы, рыхтавацца да пераезду з абрыдлага аварыйнага жылля. Але аказалася, што яны занадта спяшаліся...

— З тых часоў і тэлефануем, і пішам, ужо больш за паўгода — калі ж можна будзе пераехаць? Адказ адзін і той жа — чакайце. У рэшце рэшт, у лютым вырашыла напісаць у Адміністрацыю Прэзідэнта. А ўчора зноў тэлефанавала ў УКБ Цэнтральнага раёна. Сказалі патэлефанаваць пасля 10 сакавіка. Як мне растлумачылі, тое рашэнне, якое было па нашым пытанні аб засяленні на Карвата, страціла сілу. Неабходна новае рашэнне. Я проста хачу зразумець, чаму ўсе выехалі, а мы засталіся? Неяк жа з іншымі ўдалося ўсё гэта давесці да канца... А з намі — чаму так атрымалася?



Шпалеры не трымаюцца на сценах. Стары дом даўно выпрацаваў свой рэсурс.

## Што расказалі ва УКБ

Каб знайсці адказ на кватэрнае пытанне сям'і Кудзіных, адпраўляемся ва Упраўленне капітальнага будаўніцтва Цэнтральнага раёна Мінска.

— Усю гэтую тэрыторыю мы будзем забудоўваць: у цэлым, у раёне Валгаградскай будзе пабудавана пяць жылых шматкватэрных дамоў, — расказаў **намеснік дырэктара КУДП «Упраўленне капітальнага будаўніцтва Цэнтральнага раёна г. Мінска» Максім ДЗЯНІСІК.** — Завяршэнне праектных работ па гэтых дамах запланавана на снежань 2021 года, і знос старых канструкцый таксама запланаваны на бягучы год. Таму нам гэтаксама, як і сям'і Кудзіных, важна як мага хутчэй рэалізаваць іх правы на пераезд у новую кватэру. Сітуацыя, што склалася вакол гэтай кватэры, — нетыповая, такое бывае рэдка. І мы спадзяёмся, яна вырашыцца як мага хутчэй.

***— Чаму гэтая сітуацыя ўзнікла?***

— Растлумачу, як адбываецца адсяленне з дамоў, што ідуць пад знос. Першапачаткова афармляецца акт выбару месца размяшчэння зямельнага ўчастка і паралельна робіцца ацэнка нерухомай маёмасці на гэтай тэрыторыі. Калі акт зацвярджаецца Мінгарвыканкамам, рыхтуецца рашэнне аб маючым адбыцца адабранні. Гэта рашэнне ў нас было ў 2018 годзе, 20 верасня. Згоду на пераезд у кватэру на вуліцы Карвата сям'я Кудзіных дала 15.07.2020.

***— Чаму столькі часу — два гады — паміж дзвюма гэтымі падзеямі?***

— У адпаведнасці з заканадаўствам, забудоўшчыку выдзяляецца пэўны набор кватэр. Усё гэта — новыя кватэры, але не заўсёды ў людзей ёсць выбар варыянтаў, паколькі паводле закона кватэра павінна быць супастаўная па агульнай плошчы з той, з якой жыхары выязджаюць. Мы не маем права пагоршыць жыллёвыя ўмовы грамадзян. 15 ліпеня ва УКБ паступіла заява аб згодзе Кудзіных. Справаздача «Белдзіпразема» па гэтай нерухомай маёмасці была перададзена нам 23 жніўня — гэта досыць аператыўна. Пасля гэтага мы падрыхтавалі праект рашэння аб выдзяленні жылога памяшкання ва ўласнасць грамадзян. 7 верасня быў распачаты працэс узгаднення ўсіх дакументаў у Мінгарвыканкаме. Такім чынам, ніякіх затрымак з нашага боку не было. Але тэрмін дзеяння рашэння аб адабранні — самага першага дакумента ў гэтым спісе — складае два гады. Ён скончыўся 20 верасня мінулага года.

Яшчэ б два тыдні, кажа суразмоўнік, і сям'я Кудзіных зімавала б у новай кватэры. А так усю працэдуру прыйшлося пачынаць спачатку.

— Мы звярнуліся па паўторны акт выбару зямельнага ўчастка, і нам яго зацвердзілі ў лістападзе мінулага года. Зараз паўторна ўзгадняем усе неабходныя дакументы. Але цяпер гэта будзе даволі хуткая працэдура. Кватэра ўжо ёсць, і мы плануем, што ў красавіку, самае позняе — у маі Кудзіны пераедуць у яе.

Ну, а Ларыса Аркадзеўна пакуль не рашаецца загадваць наперад і нешта планаваць. Яна кажа, што проста спадзяецца: яе сям'і, па меншай меры, не прыйдзецца правесці ў аварыйным доме яшчэ і наступную зіму...

«Звязда» будзе сачыць за развіццём падзей.

**Дзіяна РОНІНА.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
26 лютага 2021 г. № 7 (592)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ДОБРЫЯ НАВІНЫ

# З НАВАСЕЛЛЕМ,

## або Пачым «кілават» камфорту?



Навасёл электрадома Генадзь АНЦІПЕНКА.




Фота Марыны ВАСІЛЬЕВАЙ.

**НА Гомельшчыне набірае тэмп будаўніцтва шматкватэрнага жылля, дзе пры дапамозе электраэнергіі забяспечваецца ацяпленне, падагрэў вады і прыгатаванне ежы. Першай падобнай навабудоўляй у рэгіёне стаў 60-кватэрны дом у рабочым пасёлку Бальшавік, што ў Гомельскім раёне. Электрадом «сілкуецца» ад аўтаномнай электракацельні.**

Навасёлы пяціпавярхоўка, дзе прадугледжана арэнднае жыллё, цяпер матывуюць не толькі жыхароў свайго раёна, але і гамяльчан абіраць менавіта варыянт электрадома.

— У нас трое дзетак — шэсць і пяць гадоў, малодшаму сем месяцаў. Марылі ў новай кватэры сустракаць Новы год, але засяліліся крыху пазней. Уваходзіны яшчэ не справілі, пакуль, лічыце, «на сумках», абжываемся, — дзеляцца навасёлы трохпакаёвай кватэры ў электрадоме, маладыя бацькі Настасся і Андрэй Чэпікавы. Сужэнцы самі родам з рабочага пасёлка Бальшавік. У чаргу на паляпшэнне жыллёвых умоў сталі ў 2016 годзе.

— Чакалі будаўніцтва кааператыўнага жылля, а потым вырашылі разгледзець варыянт арэнднага ў новым электрадоме. Мы задаволены. Ужо аплацілі першую «плацёжку» — за святло выйшла 20 рублёў за 100 кВт•ч. Пры гэтым у апошнія моцныя маразы ў кватэры было нават горача. На батарэях у нас рэгулятары, можам самі «выстаўляць» тэмпературу.

Яшчэ адны навасёлы электрадома — ветэраны працы, якія шмат гадоў прапрацавалі на заводзе тарфянога машынабудавання «Бальшавік», Людміла і Генадзь Анціпенкі. Сужэнцы пераехалі ў новае жыллё са старога дома барачнага тыпу:

*(Заканчэнне на 17-й стар.)*

АКТУАЛЬНЫ ДЫЯЛОГ

# РАЗУМНЫ ГОРАД РАЗУМНЫХ ЛЮДЗЕЙ



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

## Аб прыярытэтах дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета ў рэалізацыі планаў новай пяцігодкі з яго старшынёй Андрэем БУГРОВЫМ гутарыць карэспандэнт «МС»

***— Андрэй Аляксандравіч, у чым адметнасць і своеасаблівасць новай пяцігодкі для Мінска?***

— На VI Усебеларускім народным сходзе тэме развіцця Мінска на наступныя пяць гадоў было аддадзена шмат увагі. Пра планы яго жыхароў на пяцігодку ёмістa і даходліва крыху раней расказаў у сваім выступленні на сходзе ўдзельнікаў усенароднага веча ад Мінска старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір Кухараў. Няма сэнсу паўтараць. Адзначу толькі, што дэпутаты Мінгарсавета задачы на будучую пяцігодку ацэньваюць як вельмі адказныя, напружаныя, але рэальныя.

*(Заканчэнне на 8-й стар.)*

НАРОДНЫ СХОД: ВЫНІКІ І ВЫСНОВЫ

## «Будучыня Беларусі ў нашых руках»

**Таццяна РУНЕЦ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах:**



— Гэта не проста словы, а рэальнасць, якая сёння як ніколі аказалася актуальнай і вывераной. Толькі разам мы можам зрабіць наша жыццё шчасным, мірным і з надзеяй думаць пра будучыню.

Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2021—2025 гады, разгледжаная на шостым Усебеларускім народным сходзе, накіравана на забеспячэнне стабільнасці ў грамадстве і рост дабрабыту грамадзян. Узяты напрамкі на пабудову моцнай эканомікі, развіццё рэгіёнаў, стварэнне роўных умоў для прадпрыемстваў усіх формаў уласнасці, нарошчванне экспартнага патэнцыялу. Пры гэтым захоўваецца сацыяльная накіраванасць нашай дзяржавы.

Задачы пастаўлены сур'ёзныя. Кожны з нас, выконваючы на высокім прафесійным узроўні свае абавязкі, робіць свой унёсак у іх дасягненне. І, як сказаў Прэзідэнт нашай краіны, на кожным з беларусаў ляжыць адказнасць за лёс краіны.

## «Трэба правесці «інвентарызацыю» партый...»

**Так лічыць Алег ДЗЯЧЭНКА, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання ад Магілёўскай вобласці, дэлегат VI Усебеларускага народнага сходу.**



— Усебеларускі народны сход — гэта яшчэ адна магчымасць дэмакратычна і на высокім узроўні шчыра і адкрыта абмеркаваць пытанні сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага развіцця сучаснага беларускага грамадства. Напярэдадні яго былі сабраныя і абагульненыя тысячы прапаноў, якія атрымалі адабрэнне дэлегатаў VI Усебеларускага народнага сходу.

Найбольш актуальныя тэмы — гэта канстытуцыйная рэформа і партыйнае будаўніцтва. Маё асаблівае меркаванне — не варта спяшацца са стварэннем новых партый. Іх і так дастаткова для паўнавартаснага палітычнага жыцця. З трыбуны Усебеларускага народнага сходу была агучана цікавая прапанова — правесці своеасаблівую «інвентарызацыю» і перарэгістраваць палітычныя партыі. Тыя з іх, якія страцілі давер людзей і існуюць толькі ў дакументах, неабходна неадкладна вывесці за перыметр палітычнага працэсу.

Заслугоўвае ўвагі прынятае рашэнне аб прызнанні Усебеларускага народнага сходу вышэйшай формай народнага прадстаўніцтва і нададзення яму адмысловага прававога статусу, які будзе замацаваны ў заканадаўстве.

Мы захавалі палітычны курс на пабудову дзяржавы для народа, на абарону сацыяльных заваёў працоўных. Мінулы год усім наглядна прадэманстраваў устойлівасць беларускай сацыяльна-эканамічнай і грамадска-палітычнай сістэмы. Гэта прызнаюць і нашы палітычныя праціўнікі, якія выехалі за мяжу і фактычна пагадзіліся са сваім паражэннем у палітычным жыцці. Народ у сваёй большасці іх не падтрымаў.

Дэлегаты VI Усебеларускага народнага сходу аднадушна падтрымалі Праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця нашай краіны на 2021—2025 гады. Такой грунтоўнай праграмы не было і няма ў нашых палітычных апанентаў.

2021 год аб'яўлены ў нашай краіне Годам народнага адзінства. Перад пагрозай унутраных і знешніх выклікаў усім беларусам неабходна аб'яднацца для абароны нацыянальных інтарэсаў, захавання сваёй ідэнтычнасці, грамадства і дзяржавы.

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар Лісковіч правядзе 27 лютага прамую тэлефонную лінію па пытаннях сацыяльнай сферы.**

*Званкі прымаюцца з 10.00 да 12.00 па тэлефоне ў Мінску 8 (017) 328 53 24.*

НА ПАРАДКУ ДНЯ

# ЖАДАННІ І МАГЧЫМАСЦІ

**Сёння ў краіне інстытут сям'і карыстаецца вялікай павагай і ўсебаковай падтрымкай. Асаблівая ўвага — да шматдзетных сем'яў. Іх звароты, пытанні і праблемы заўсёды знаходзяць разуменне ў членаў верхняй палаты Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.**


sovrep.gov.by

Таццяна РУНЕЦ у час нарады.

Каб высветліць сітуацыю, аб'ектыўна разабрацца ў праблемах мінскай шматдзетнай сям'і, **член Прэзідыума Савета Рэспублікі, старшыня Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ** была вымушана правесці спецыяльную нараду. Нагода — зварот галавы гэтай сям'і з просьбай пасадзейнічаць у пастаноўцы яе на ўлік менавіта як шматдзетнай. Да размовы былі запрошаны прадстаўнікі Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, адміністрацый Фрунзенскага і Маскоўскага раёнаў сталіцы.

Удзельнікі нарады дэталёва вывучылі ўзнятыя ў звароце пытанні, абмяняліся думкамі, выказалі свае пазіцыі і разгледзелі магчымыя шляхі вырашэння жыллёвай праблемы ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам. Сям'і былі прапанаваны варыянты пастаноўкі яе на ўлік для паляпшэння жыллёвых умоў.

У ходзе пасяджэння Таццяна Рунец нагадала, што ў Беларусі падтрымка сям'і з'яўляецца адным з прыярытэтаў дзяржаўнай палітыкі. Бо сям'я ў нас — аснова захавання і развіцця беларускай нацыі, сказала сенатар.

Клопатам аб шматдзетных сем'ях была прасякнута рабочая паездка ў Гродзенскую вобласць **старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктара ЛІСКОВІЧА**. У прыватнасці, у Слонімскім раённым выканаўчым камітэце ён правёў прыём непаўналетніх і іх законных прадстаўнікоў. Сустрэчы адбыліся ў рамках работы Нацыянальнай камісіі па правах дзіцяці.

Частка наведвальнікаў паставіла пытанні, якія датычацца падтрымкі шматдзетных сем'яў, выкарыстання мацярынскага капіталу, давання льгот выпускнікам профільных класаў пры паступленні ў ВНУ і іншыя. Напрыклад, сям'я, у якой 10 сваіх і прыёмных дзяцей, жыве ў добраўпарадкаваным катэджы плошчай больш за 300 кв. м. Пры гэтым ёсць жаданне і магчымасць прыняць на выхаванне больш дзяцей, але заканадаўствам абмежавана максімальная колькасць выхаванцаў. З-за гэтага не атрымалася ўзяць у сям'ю дваіх сірот — брата і сястру.

На думку Віктара Лісковіча, у такіх сітуацыях неабходна ісці насустрач. Паводле яго слоў, сенатары будуць працаваць над тым, каб унесці адпаведныя змяненні ў нарматыўныя акты. Калі ёсць жаданне, магчымасць, дазваляюць умовы, то чаму б не дапамагчы гэтай сям'і зрабіць добрую справу, задаўся пытаннем сенатар.

Яшчэ адно цікавае і злабадзённае пытанне паставіла маці пяцярых дзяцей са Слоніма. Падчас прыёму яна акрэсліла праблему, якая яе хвалюе: статус шматдзетнай сям'я страчвае, напрыклад, калі старэйшаму дзіцяці спаўняецца 18 гадоў. Але многія з дзяцей вучацца ў каледжах і ўніверсітэтах, таму, калі гэта магчыма, варта было б захоўваць статус шматдзетнай сям'і на час вучобы дзяцей, — адзначыла яна.

Гэта пытанне, паабяцаў старшыня Пастаяннай камісіі, будзе прапрацавана з зацікаўленымі ведамствамі.

**Леанід ТУГАРЫН.**

НАРОДНЫ СХОД: ВЫНІКІ І ВЫСНОВЫ

# РАЗВІВАЦЬ І ЎМАЦОЎВАЦЬ ГЛЫБІНКУ



**— На Усебеларускім народным сходзе, дэлегатам якога я быў, разгледжана стратэгія развіцця вёскі — гаворыць старшыня Маларыцкага раённага Савета дэпутатаў Алег ЯКУБЧЫК. — Яшчэ на этапе падрыхтоўкі да сходу я размаўляў з многімі сельскім жыхарамі на гэту тэму.**

Усе ў адзін голас адзначаюць, што за апошнія дзесяцігоддзі зроблена вельмі шмат для стварэння ўмоў жыцця на вёсцы, непазнавальна змянілася інфраструктура сельскіх населеных пунктаў. Уладкаванне аграгарадкоў было прарывам на пэўным этапе. А сёння трэба ісці далей. Гэта думка ўпэўнена прагучала і на сходзе.

Для жыцця на сяле ёсць усё: дабротнае жыллё і магчымасць яго будаўніцтва, гандаль, сацкультбыт. Вясковаму чалавеку зараз патрэбна рабочае месца, якое гарантуе годную зарплату і ўпэўненасць у заўтрашнім дні. Прыватны бізнес павінен рухацца ў глыбінку, развіваць не толькі гандаль, але і вытворчасць. Цяпер прадпрымальнік можа тут не толькі, умоўна кажучы, гаршкі ляпіць, але і выпускаць прадукцыю з дапамогай 3D-прынтара. Адлегласці ж па цяперашнім часе не маюць прынцыповага значэння.

Яшчэ адна задача на найбліжэйшую перспектыву — развіваць сельскагаспадарчы бізнес, маюцца на ўвазе фермерскія і сялянскія гаспадаркі. У гэтай сферы людзі павінны таксама атрымліваць легальныя пастаянныя рабочыя месцы. Неабходна спрасціць працэдуру найму як сезонных, так і пастаянных работнікаў — пра гэта не раз чуў ад фермераў.

Праграма на наступную пяцігодку прынятая, стратэгія развіцця вызначаная, зараз час распрацоўваць інструменты рэалізацыі як на заканадаўчым узроўні, так і ў практычным плане.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# РАЗУМНЫ ГОРАД РАЗУМНЫХ ЛЮДЗЕЙ

***(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)***

Так, няпроста будзе мінчанам забяспечыць наменчанае развіццё індустрыяльнага патэнцыялу горада на новай тэхналагічнай базе, лічбавізацыю эканомікі, правядзенне актыўнай інвестыцыйнай палітыкі, рэалізацыю комплекснай лічбавай трансфармацыі інфраструктуры ў рамках праграмы «Разумны горад». А яшчэ наладзіць выпуск шырокай гамы новай прадукцыі машынабудавання, прыборабудавання і электронікі, оптыкі, лазернай і цеплавізійнай тэхнікі, новага класа антыбіётыкаў, новых матэрыялаў і пакрыццяў, стварыць яшчэ шмат чаго новага. Усяго не пералічыць.

***— А якія прыярытэты ў сувязі з рэалізацыяй гэтых маштабных планаў вызначылі для сябе дэпутаты Мінгарсавета?***

— Наша зона адказнасці — сацыяльная сфера, адукацыя, культура, медыцына. Яе далейшае развіццё напрамую залежыць ад укаранення лічбавых тэхналогій у сістэму аховы здароўя ў рамках рэалізацыі праектаў «Разумная паліклініка», «Разумная бальніца» і «Разумная хуткая медыцынская дапамога». Запланавана пабудаваць у Мінску сем паліклінік і шэсць стацыянараў. Дзіцячыя паліклінікі з'явяцца ў мікрараёнах Сухарава-3, Лошыца-9, «Мінск Свет». Таксама ўзвядуць новы будынак 9-й дзіцячай паліклінікі, дзве дарослыя паліклінікі і новы будынак 15-й гарадской паліклінікі.


n1.by

***— Кватэрнае пытанне сярод мінчан не страчвае сваю вастрыню. І гэта нягледзячы на мільёны здадзеных апошнім часам квадратных метраў новага жылля. Шмат надзей сёння ўскладаецца на гарады-спадарожнікі. Наколькі спадзяванні апраўданыя?***

— Пазіцыя гарсавета — актыўнае развіццё гарадоў-спадарожнікаў даўно наспела. Менавіта развіццё, а не толькі будаўніцтва жылых дамоў. Там неабходна адначасова адкрываць установы адукацыі, культуры і аховы здароўя. І яшчэ, на мой погляд, у гарадах-спадарожніках трэба рабіць стаўку на стварэнне малых прадпрыемстваў, каб людзі маглі працаваць там, дзе яны пастаянна жывуць. Чакаем інвестараў, якія будуць распачынаць вытворчасць у гарадах-спадарожніках. Там, магчыма, і мінскія прадпрыемствы пачнуць адкрываць свае філіялы. Чаму б і не?

Колькасць насельніцтва сталіцы ўжо перавышае два мільёны чалавек. Месца для новых жылых кварталаў застаецца ўсё менш. А ў горадзе-спадарожніку людзі маюць магчымасць вырашыць сваю жыллёвую праблему. Кошт квадратнага метра там значна ніжэйшы, чым у сталіцы. Напрыклад, забудоўшчык камерцыйнага жылля на месцы былога тралейбуснага парка непадалёку ад плошчы Перамогі заявіў папярэднюю цану квадратнага метра ў эквіваленце 3,5 тысячы долараў ЗША. А ў горадзе-спадарожніку жыллё абыдзецца ў некалькі разоў танней. Чым не перавага, асабліва для шматдзетных сем'яў? Таму мясцовая ўлада сталіцы лічыць мэтазгодным у першую чаргу больш актыўна прапаноўваць ім жыллё ў горадзе-спадарожніку.

Упэўнены, уласная кватэра, побач рабочае месца, зручныя транспартныя зносіны са сталіцай, безумоўна, падштурхнуць маладыя сем'і мінчан рабіць выбар на карысць Смалявіч, Лагойска ці Заслаўя.

***— Маладыя сем'і, ды і не толькі мінчан, звычайна яшчэ маюць патрэбу ў дзіцячых садках і школах у крокавай даступнасці. А іх пакуль не хапае і ў сталіцы, і ў яе прыгарадах. Як дэпутаты мяркуюць выпраўляць сітуацыю?***

— Ёсць адпаведная гарадская праграма, і яна будзе выканана. Аднак, калі прааналізаваць сітуацыю ў Мінску ў цэлым, то загрузка школ і садкоў у нас не ўсюды поўная. Скажам, на тэрыторыі старой жылой забудовы Мінска ў тых жа дашкольных установах у групах па 5—7 чалавек. Гэта практычна індывідуальнае навучанне і выхаванне. Ці возьмем Серабранку. У свой час у мікраёне нараджаўся бэбі-бум, і, натуральна, узводзіліся новыя дашкольныя ўстановы. Цяпер жа ў іх шмат свабодных месцаў. Сёння дэпутаты абмяркоўваюць гэтыя пытанні. Нам яшчэ неабходна павялічыць колькасць ясельных груп, яны ёсць не ў кожным садку. На маю думку, трэба будаваць дашкольныя аб'екты, я сказаў бы, двайнога прызначэння.

***— Што вы маеце на ўвазе?***

— Гэта такія будынкі, якія пры неабходнасці можна перафарміраваць. Напрыклад, сёння ў новым жылым масіве гэта, безумоўна, дзіцячы садок. Але час хутка ляціць, і ўжо заўтра патрэба ў месцах знізіцца як у Серабранцы. Што рабіць? Бо грошы ўкладзены салідныя — па сённяшніх цэнах адзін дзіцячы садок абыходзіцца бюджэту горада прыблізна ў чатыры мільёны рублёў. Дык чаму б не пераабсталяваць частку будынка ў адукацыйны цэнтр для дзяцей і падлеткаў. Задача няпростая, але вырашальная і перспектыўная.

Мінскія ўлады таксама гатовыя разглядаць прапановы бізнесменаў з даваннем ім пэўных прэферэнцый. Разам можна знайсці залатую сярэдзіну ў стварэнні дзіцячай адукацыйнай інфраструктуры. Відаць, пашырыцца сістэма прыватных садкоў. У бацькоў павінна быць права выбару. Гэта нармальная практыка. Чаму б бізнесу не будаваць за свае сродкі садкі, каб потым іх здаваць у арэнду. Можна знайсці і іншыя варыянты дзяржаўна-прыватнага ўзаемадзеяння. Было б жаданне.

***— Аб бурным росце сталіцы сведчыць і той факт, што пабудаваныя пасля вайны на ўскрайку горада заводы з часам апынуліся ў цэнтры ці амаль што ў цэнтры горада. Ужо не першы год чуюцца прапановы мінчан выносіць такія заводы за межы горада. Якое ваша меркаванне як старшыні Мінгарсавета на гэты конт?***

— Як вядома, днямі ўрад Беларусі зацвердзіў пералік горадаўтваральных і сістэмаўтваральных гаспадарчых таварыстваў. Першынство ў гэтым спісе, вядома, за Мінскам — 20 такіх прадпрыемстваў. Сярод іх Мінскі трактарны завод, «Атлант», Мінскі маторны завод, «Керамін» і іншыя. І што, усе 20 ці большасць з іх узяць і перанесці за межы Мінска? Не варыянт. А вы падлічыце, колькі на гэта сродкаў спатрэбіцца!

Аптымальны шлях развіцця такіх прадпрыемстваў — іх глыбокая мадэрнізацыя. І мы чакаем салідных інвестараў, якія на выгадных для горада і сябе ўмовах, узяліся за гэтую б справу.

***— Летась, ды і сёлета, значнай часткі жыхароў псавалі настрой, мякка кажучы, дрэнны пах і непразрыстасць вады ў кранах. Што робіцца, каб у будучым мінімізаваць такія здарэнні?***

— Пытанні забеспячэння мінчан якаснай вадой пастаянна знаходзяцца ў полі зроку Мінгарсавета. Нашы дэпутаты неаднойчы абмяркоўвалі праблемныя выпадкі з вадой у сваіх камісіях з запрашэннем кіраўніка «Водаканала», патрабавалі хутка прыняць меры і выправіць хібы ў рабоце.

Зараз мясцовыя ўлады горада, у тым ліку і дэпутаты Мінгарсавета, завяршаюць дэталёвую падрабязную распрацоўку плана мерапрыемстваў па рэалізацыі задач, пастаўленых перад сталіцай на VI Усебеларускім народным сходзе. Там было вырашана да 2025 года поўнасцю забяспечыць Мінск вадой з артэзіянскіх крыніц. Скажу, што зрабіць гэта будзе не проста. Тут ёсць адзін нюанс: на тэрыторыі горада і вакол яго няма ў дастаковых аб'ёмах падземных радовішчаў вады. Яе прыйдзецца па трубах дастаўляць з іншых раёнаў вобласці. Спатрэбяцца каласальныя сродкі — сотні мільёнаў рублёў.

Работа на найбліжэйшыя гады чакаецца і вялікая, і складаная, але я ўпэўнены, што мінчане будуць ужываць якасную артэзіянскую ваду. Ва ўсякім разе для дэпутатаў Мінгарсавета гэта задача — прыярытэт. У нас жа разумны горад разумных людзей. І ўсё ў нас атрымаецца.

**Гутарыў Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

# Новы старт для маладых талентаў

**Юбілейны Рэспубліканскі творчы радыёконкурс «Маладыя таленты Беларусі», які ў гэтым годзе пройдзе ў дзясяты раз, рыхтуецца да старту.**
**З 1 да 31 сакавіка пройдзе прыём заявак ад удзельнікаў, якія жадаюць заявіць пра сябе на адным з найбольш прэстыжных спаборніцтваў.**

— Конкурс гэтага года ў нас юбілейны, і мы сфакусіраваліся менавіта на ўласнай даце. Вызначылі дзевяць намінацый, аб'яднаўшы ўсе кірункі, якія ў нас былі за гэты час. Так, напрыклад, вярнулі такія намінацыі, як «Акадэмічны вакал», «Харавая творчасць» і іншыя. Але сёлета, улічваючы і зваротную сувязь, і тое, што з кожным годам колькасць удзельнікаў павялічваецца, вырашылі жанрава пашырыць межы. Што да тэматыкі, то ў нас з самага першага спаборніцтва застаецца беларускі акцэнт. Таму ў першым туры ўсе, незалежна ад намінацыі і ўзросту, удзельнікі павінны выканаць твор беларускага кампазітара, аўтара, а вакалісты — яшчэ і на беларускай мове. Гэта той акцэнт, які ў нас застанецца нязменным, — дзеліцца **аўтар і кіраўнік праекта «Маладыя таленты Беларусі» Таццяна ЯКУШАВА.** — Удзельнікам, якія хочуць сябе паказаць, складана параіць нешта канкрэтнае, але скажу пра галоўнае: заставайцеся самімі і развівайце ўласную індывідуальнасць. І інструменталістам, і вакалістам раю: шукайце такія складаныя, адмысловыя творы, якія будуць дэманстраваць вашу непаўторнасць. Зразумела, што ёсць пэўныя прафесійныя параметры, па якіх журы ацэньвае канкурсантаў, але важна і тое, які за ўсім гэтым стаіць чалавек. Мы шукаем перш за ўсё яркіх творчых асоб. І калі мы крыху дапаможам ім паказаць сябе, то будзем задаволеныя.

Узяць удзел у спаборніцтве талентаў маюць магчымасць навучэнцы ўстаноў агульнай, сярэдняй, сярэдне-спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, дзіцячых школ мастацтва ва ўзросце ад 10 да 25 гадоў. Заявіць пра сябе сёлета ўдзельнікі могуць у наступных намінацыях: «Эстрадны вакал. Салісты», «Эстрадны вакал. Ансамблі», «Інструментальная музыка. Салісты», «Інструментальная музыка. Ансамблі», «Спадчына. Салісты», «Спадчына. Ансамблі», «Акадэмічны вакал. Салісты», «Інструментальная музыка. Аркестры», «Харавая творчасць».

Трэба адзначыць, што пакуль адборачныя туры пройдуць у дыстанцыйным фармаце. То-бок удзельнікам трэба зрабіць відэазапіс свайго выканання твора і даслаць яго на адрас арганізатараў: 220114, г. Мінск, вул. Чырвоная, 4, альбо на электронную пошту: talentbelarus@gmail.com з пазнакай «Маладыя таленты Беларусі». З Палажэннем конкурсу і патрабаваннямі для падачы заяўкі можна азнаёміцца на сайце Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё — www.radio1.by, а таксама на афіцыйных старонках канала ў сацыяльных сетках.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 134

Сёння для самастойнага рашэння ў шашкі-64 прапануюца кампазіцыі, якія даслаў Дзмітрый Камчыцкі з Магілёва.

№ 24



№ 24
Белыя простыя шашкі: c1, d2, c3, e3, g3, a7 (6)
Чорныя простыя шашкі: h4, c5, e5, b6, d6, e7 (6)
№ 25
Белыя простыя шашкі: g3, c5, g5, b6, d6, h6, c7, e7 (8)
Чорныя простыя шашкі: b2, d2, e3, d4, f6, a7, b8, f8 (8)
№ 26
Белыя простыя шашкі: e1, d2, f2, c3, e3, f4, b6, h6, a7 (9)
Чорныя простыя шашкі: h2, a3, b4, h4, a5, d6, g7, b8, d8, f8 (10)
№ 27
Белыя простыя шашкі: c1, a3, e3, d4, c5, g5 (6)
Чорныя простыя шашкі: d2, f4, h4, a5, h6, c7, e7, g7 (8)

Кампазіцыі ў шашкі-100 даслаў па электроннай пошце Анатоль Баланюк, горад Тэпладар Адэскай вобласці, Украіна.
№ 28
Белыя простыя шашкі: 47, 48, 42, 45, 36, 38, 34, 29, 22, 17, 18 (11)
Чорныя простыя шашкі: 40, 33, 35, 26, 28, 21, 24, 20, 9, 10 (10)
№ 29
Белыя простыя шашкі: 48, 42, 45, 36, 38, 34, 29, 23, 17, 18 (10)
Чорныя простыя шашкі: 40, 33, 26, 27, 21, 24, 20, 15, 8, 9, 10 (11)
№ 30
Белыя простыя шашкі: 48, 42, 45, 36, 38, 34, 29, 17, 18 (9)
Чорныя простыя шашкі: 40, 33, 26, 27, 23, 24, 16, 20, 9 (9)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

**Праверце свае рашэнні**

Выпуск № 133 ад 13.02.2021.
№ 16 1.e7-d6 a7-b6 (A)
[A 1...h6-g5 2.d6-g3 g5:e7 3.d8:f6 a7-b6 4.g3-f2 b6:d8 5.f8-e7 d8-c7 6.f6-g5 h8:d8 7.g5-e7 d8:f6 8.h4-g5 f6:h4 9.f2-g3 h4:d4 10.b4-c5 d4:b6 #]
2.d8-e7 b6:d8 3.d6-c7 d8:b6 4.a5:c7 h6-g5 5.e7-d6 g5:a3 6.c7-b8 h8:f6 7.f8-b4 a3:c5 8.e3-d4 c5:e3 9.b8-f4 e3:g5 #
№ 17 1.d4-c5 d6:b4 2.e1-d2 c3:e1 3.a1:c7 b8:d6 4.f4-e5 d6:h6 5.c1-b2 a3:c1 6.g3-h4 e1:g3 7.h2:f4 c1:g5 8.h4:d8+
№ 18 1.d4-e5 f4:d6 2.c3-d4 a5:e5 3.g7-f8 d6:b4 4.f8:a5 e3-f2 5.a5-b6 f2-e1
[5…f2-g1 6.b6-a7 h4-g3 7.h2:f4 g1-h2 8.a7-b8]
6.b6-f2 e1:g3 7.h2:f4 h4-g3 8.f4:h2+
№ 19 1.f2-e3 d4:f2 2.g5-f6 e7:g5 3.e1-b4 a5:c3 4.g3:f4 e5:g3 5.h2:f4 h4-g3 6.f4:h2+
№ 20 1.f2-e3 h4:d4 2.f4-g5 f6:h4 3.h2-g3 h4:f2 4.g1:e7 f8:d6 5.h6:a7+
№ 21 1.d2-e3 d6:d2 2.b4:b8 d2:b4 3.b8-e5 g7-h6 4.e5-f6 h6-g5 5.f6:h4 b4-c3 6.h4-f6 a3-b2 7.c1:a3 c3-d2 8.f6-c3 d2:b4 9.a3:c5+
№ 22 1.30-24 19:30 2.42-37 31:33 3.39:08 27:40 4.08-02 16:27 5.02:07 34-39 6.07-34 39:30 7.25:34+
№ 23 1.30-24 19:30 2.42-37 31:33 3.39:08 27:40 4.08-02 16:27 5.02:22+

Першымі дакладныя адказы даслалі С. Рашэцін (Ашмяны), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці), В. Дударэвіч (в. Новая Мыш Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці), Э. Дамброўскі, П. і В. Шульгі (усе Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), В. Ваўчкоў (Маладзечна), С. Лойка (Украіна).

Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, Мінск. E-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**





Сядзі і глядзі

# ЗГАДАЕМ МАЙСТРОЎ СЛОВА

**Сусветны дзень пісьменніка 3 сакавіка на канале «Беларусь 3» адзначаць паказамі праграм, прысвечаных беларускім класікам. А 5 сакавіка ўбачым экранізацыю п'есы «Хто смяецца апошнім» Кандрата Крапівы, юбілей якога адзначаецца сёлета.**

У рамках праекта «Запіскі на палях», які распавядае пра тых выбітных людзей, якія сваімі рукамі і словамі будавалі айчынную культуру, згадаем пісьменнікаў, паэтаў, драматургаў. Убачым выпускі «Адам Міцкевіч: чужая нявеста», «Андрэй Макаёнак: апостал беларускай драматургіі», «Якуб Колас: самая прыгожая кветка Палесся», «Ніл Гілевіч: родны і народны». Выпускі праграмы «Камертон» будуць прысвечаны паэту Уладзіміру Мазго, які адзначае дзень нараджэння 5 сакавіка, а таксама заслужанаму дзеячу культуры Рэспублікі Беларусь Мікалаю Чаргінцу. А выпуск аўтарскай праграмы Уладзіміра Арлова «Люблю і памятаю», дзе аўтар згадвае тых, з кім яго ў свой час звёў лёс, раскажа гледачам пра Уладзіміра Караткевіча.





Нам таксама пакажуць выпуск дадзенага праекта 5 сакавіка, ён будзе прысвечаны драматургу, паэту, сатырыку, народнаму пісьменніку БССР Кандрату Крапіве. У гэты дзень адзначым 125 гадоў з дня нараджэння майстра слова. Для тых, хто любіць глядзець экранізацыі напісанага ў кнігах, на «Беларусь 3» пакажуць кінастужку «Хто смяецца апошнім» вытворчасці «Беларусьфільм». Сатырычную кінакамедыю зняў Уладзімір Корш-Саблін у 1954 годзе. Годам раней рэжысёр прадставіў экранізацыю п'есы пісьменніка «Спяваюць жаваранкі». Ён высока цаніў літаратуру, і з ім, адчуваючы гэтае шчырае стаўленне да мастацкага слова, сябравалі многія пісьменнікі, якія заўсёды ахвотна падключаліся да працэсу стварэння фільмаў. Сам твор Кандрата Крапівы ўбачыў свет яшчэ ў 1939 годзе, але, што і робіць сапраўдную літаратуру класікай, яго сюжэт не страчвае сваёй актуальнасці да сённяшняга дня. Дарэчы, камедыю пасля выхаду паставілі ў Купалаўскім тэатры, а вось кінаверсія з'явілася значна пазней.

Дзеянне адбываецца ў навукова-даследчым інстытуце ў 50-я гады. Супрацоўнік Туляга расказвае сваім калегам — вядомаму вучонаму Чарнавусу і маладому навуковаму супрацоўніку Веры — што пешаход на вуліцы прыняў яго за палкоўніка Падгалецкага, які некалі служыў у Варонежы. Туляга спалоханы і просіць нікому пра гэта не расказваць. Размову калег чуе пляткар Зёлкін і перадае яе дырэктару інстытута Гарлахвацкаму. А яшчэ распаўсюджвае чутку пра тое, што новы рукапіс Чарнавуса, які напярэдадні раскрытыкаваў Зёлкіна, атрымаў дрэнныя водгукі. Дырэктар — невук, трапіў на пасаду па сувязях, — вырашае выкарыстаць сітуацыю ў сваіх інтарэсах. Але, як вядома, смяецца той, хто смяецца апошнім. Ролі герояў у фільме выконваюць акцёры Уладзімір Уладамірскі, Барыс Платонаў, Глеб Глебаў, Лілія Драздова і іншыя. Трэба адзначыць, што Глеб Глебаў нават атрымаў за сваю ролю Тулягі Дзяржаўную прэмію СССР.

Кінастужка «Хто смяецца апошнім» — гэта вострая сатыра на тое, што наяўнасць «карысных сувязяў» і «уменне падтрымаць патрэбнага чалавека», незалежна ад прафесіі, часам аказваюцца важнейшымі за талент, адукаванасць, прыстойнасць. І гэтая сітуацыя, якая, на жаль, не змяняецца з часам. Глядзіце, разважайце і перачытвайце нашых класікаў.

**Алена ДРАПКО.**

## Беларусь 1

6.25 **Меладрама «Стань маім ценем» (16+).**
8.20 Клуб рэдактараў (16+).
**9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
9.10 «Арсенал» (12+).
9.40 Гісторыі выратавання (12+).
10.10 «Зона Х». Вынікі тыдня (16+).
10.40 Маршрут пабудаваны (12+).
11.15, 12.35 **Меладрама «Домік на шчасце-2» (16+).**
12.10 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
13.35 «Я ведаю» (6+).
15.15 Дай пяць (6+).
15.30 Вакол планеты.
16.15 «Нагода ёсць» (12+).
16.50, 19.10 **Меладрама «Сняданак у ложак». 1—4-я серыі (12+).**
20.35 Навіны надвор'я.
21.00 Галоўны эфір.
22.05 **Меладрама «Алена Выдатная». 1—4-я серыі (16+).**

## Беларусь 2

6.00 «Уключайся. Лепшае за тыдзень» (12+).
8.00, 18.30 Тэлебарометр.
8.05 **«Клон». Серыял (16+).**
10.00 Анімацыйны фільм «Гісторыя цацак: вялікія ўцёкі» (0+).
11.35 «Тры першыя спатканні» (16+).
12.25 **Прыгоды «Хронікі Нарніі: прынц Каспіян» (12+).**
14.50 «На нажах» (16+).
15.50 «Тата папаў» (16+).
17.40 «Вежа» (12+).
19.00 **Меладрама «Прыгажуня» (12+).**
21.10 Спортлато 5 з 36, КЕНА.
21.20 **Меладрама «Вострыя прыпраўы і страсці» (12+).**
23.35 «Каханне на выжыванне» (16+).

## Беларусь 3

7.30 «Святыні Беларусі».
8.00, 14.20 Навіны культуры.
8.20 **«Утаймавальніца тыграў». Маст. фільм (12+).**
10.00 «Наперад у мінулае».
10.25 «Беларуская кухня». Пражонка.
10.55 «Нацыянальны хіт-парад».
11.50 «Народны майстар». Алена Гурэцкая (лозапляценне).
12.15 «Сваімі словамі». Тэлевіктарына.
13.00 **«Варвара-краса, доўгая каса». Маст. фільм (6+).**
14.45 «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
15.00 **«Увага! Усім пастам...» Маст. фільм (12+).**
16.20 «Камертон». Кампазітар Аляксандр Балотнік.
16.45 Канцэрт «Будзь здаровы, гаспадар!» Да юбілею кампазітара Аляксандра Балотніка.
17.35 «Жывая спадчына».
18.05 **«Утаймавальніца тыграў». Маст. фільм (12+).**
19.50 «Кадры жыцця». Святлана Бароўская.
20.40 «Калыханка» (0+).
21.05 **«Па сямейных абставінах». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
23.20 Канцэрт «Аксана Волкава. Solo».

## Беларусь 5

6.45 Тэніс. WTA. Доха. Фінал.
8.45, 10.35 Біятлон. Кубак свету. Нове-Места. Спрынт. Жанчыны. Мужчыны.
10.05 Піт-стоп.
11.55, 16.30, 18.55 Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў памяшканні. Дзень трэці.
13.50 Біятлон. Кубак свету. Нове-Места. Гонка пераследу. Жанчыны.
14.30 Футбол. Кубак Беларусі. Чвэрцьфінал. Першы матч. БАТЭ (Барысаў) — ФК «Віцебск». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
17.50 Біятлон. Кубак свету. Нове-Места. Гонка пераследу. Мужчыны.
18.45 Спорт-цэнтр.
21.20 Вынікі тыдня.
22.05 Футбол. Чэмпіянат Англіі. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)

## АНТ

7.00, 9.00, 16.00 [СЦ] Нашы навіны.
7.10 «Здароўе» (16+).
8.10 «Жыццё іншых» (12+).
9.10 «Метэагід».
9.30 «Тэорыя змовы» (16+).
10.30 «Народны кухар» (12+).
11.50 «Бачылі відза?» (6+)
13.55 Святочны канцэрт, прысвечаны Дню ўтварэння беларускай міліцыі (12+).
16.20 Да юбілею Андрэя Міронава. «Слізгацець па краі» (12+).
17.15 Да юбілею Андрэя Міронава. «Здабытак рэспублікі» (12+).
18.30 «Лепш за ўсіх!» Святочны выпуск (0+).
20.00 Контуры.
21.20 «Ледніковы перыяд» (6+).
23.25 «Спартклуб» (16+).
23.45 Канцэрт гурта «Рондо» (12+).

## СТБ

6.00, 0.10 «Сакрэтныя тэрыторыі» (16+).
8.30, 12.00 Дакументальны праект (16+).
9.15 «Мінтранс» (16+).
10.00 «Скардзіцца дазваляецца».
10.30 «Вялікі горад».
11.00 «Ці ведаеце вы што?» (16+)
13.00, 13.40, 16.40 **«Маёр і Магія». Серыял (16+).**
13.30, 16.30 Навіны «24 гадзіны».
19.30 «Тыдзень».
21.05 «Засакрэчаныя спісы» (16+).

## МІР

5.00 Мультфільмы (0+).
7.10 **Маст. фільм «Казка пра страчаны час» [СЦ] (0+).**
8.50 «Наша кіно. Неўвядальныя». Да юбілею Андрэя Міронава (12+).
9.25 «ФазендаЛайф» (12+).
10.00, 16.00 Навіны (бягучы радок).
10.15 **Маст. фільм «Вій» [СЦ] (12+).**
11.50, 16.15 **Маст. фільм «Дванаццаць крэслаў» [СЦ] (12+).**
18.30, 0.00 «Разам».
19.30 **Маст. фільм «Пакроўскія вароты» [СЦ] (0+).**
22.25, 1.00 **Серыял «Цікаўная Варвара» [СЦ] (16+).**

## РТР—Беларусь

7.05 **Маст. фільм «Прадмет абажання» (12+).**
9.10 **Маст. фільм «Я не вярнуся» (12+).**
11.15 **Маст. фільм «Цягнік лёсу» (12+).**
14.25 **Маст. фільм «Адзіночка» (12+).**
16.30 **Маст. фільм «Маршруты кахання» (12+).**
20.00 Весткі тыдня.
21.05 «У людзях».
21.45 Масква. Крэмль. Пуцін.
22.25 «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

## НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
6.10 «Цела чалавека» (16+).
6.45 Беларусы (6+).
7.20 «50 рэцэптаў першага» (12+).
8.00, 10.00, 16.00 Сёння.
8.20 «24 пытанні» (12+).
8.45 «Гарады Беларусі» (6+).
9.20 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
10.20 «Кватэрнае пытанне. BY» (12+).
10.55 «Першая перадача» (16+).
11.25 «Цуд тэхнікі» (12+).
12.10 «Дачны адказ» (0+).
13.10 «НашСпажыўНагляд» (16+).
14.05 **Маст. фільм «Барс і Лялька» (12+).**
16.20 «Следства вялі...» (16+)
18.00 «Новыя рускія сенсацыі» (16+).
19.00 «Вынікі тыдня».
20.05 Ты не паверыш! (16+)
21.00 «Зоркі сышліся» (16+).
22.20 «Зразумець і абясшкодзіць» (12+).
22.50 **Маст. фільм «Нуль» (16+).**

## 8 канал

7.00, 1.15 «Надвор'е».
7.05 «Мультпарад» (6+).
8.05 «Прыколы 13-й школы» (6+).
8.10 **Камедыя «Каўказская палонніца» (0+).**
9.30 «Гатуй як шэф» (12+).
9.45 **Драма «Попел» (16+).**
12.45 **Прыгоды «Персі Джэксан і Мора пачвар» (6+).**
14.35, 17.05, 20.00, 21.00 «Надвор'е» + «Эрана».
14.40 **«Глядзім усёй сям'ёй». «Назад у будучыню-3» (12+).**
16.40 «Водары кантонскай кухні» (12+).
17.10 **Дэтэктыў «Міс Марпл. Таямніца Карыбскага заліва» (12+).**
19.15 «Суперлато».
20.05 **Серыял «Праект» Сіняя кніга» 16+).**
20.50 «Вечарніца» (6+).
21.10 **Камедыя «Дастаць нажы» (16+).**
23.20 **Вестэрн «Смерць скача на капі» (12+).**





## ВТБ

6.05 «Дурні і дарогі» (16+).
7.00, 14.20 «Раніца з гумарам» (16+).
10.45 «Наш рамонт» (16+).
11.20 «Селапаляцела» (16+).
12.10, 23.00 «КВЗ. Панашаму» (16+).
13.15 Серыял «Вароніны» (12+).
16.20 Серыял «Пекар і прыгажуня» (16+).
17.25 «Уральскія пельмені» (16+).
18.30 Серыял «Атэль «Элеон» (16+).
20.30 Серыял «Дылды» (16+).
21.30 Серыял «Івановы-Івановы» (16+).
23.00 «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
0.05, 3.55 Серыял «Беладводдзе. Тайна закінутай краіны» (16+).
1.00 Серыял «Людзі Хэ» (16+).
1.50 Серыял «Пекар і прыгажуня» (16+).
2.40 Серыял «Татавы дочкі».
4.45 «6 кадраў».

## Культура

6.30, 7.00, 7.30, 8.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...» Масква Станіслаўскага.
7.05 «Іншыя Раманавы». «Чароўная Алена» [СЦ].
7.35, 18.15, 0.00 «Чаму зніклі неандэртальцы?» Дак. фільм [СЦ].
8.35, 11.10, 13.25, 14.45, 16.20, 19.10, 20.45, 23.20 Галівуд Краіны Саветаў.
8.50 «Падкідыш». Маст. фільм.
10.15 «Назіральнік».
11.25, 1.00 XX стагоддзе. «Яўген Святланаў. Непарадны партрэт». Дак. фільм.
12.20 Колер часу.
12.30 «Аляксандраўка». Дак. фільм.
13.40 Лінія жыцця. Гедымінас Таранда.
15.05 Навіны. Падрабязна. АРТ.
15.20 «Агора». Ток-шоу.
16.40 «Вяселле». Маст. фільм.
17.40, 2.20 Сімфанічныя аркестры Расіі. Сімфанічны аркестр Масквы «Руская філармонія». Дырыжор Ф. Мастрангджэла.
19.45 «Галоўная роля».
20.05 «Правілы жыцця».
20.30 «Добрай ночы, малыя!»
21.05 Кіно пра кіно. «Масква слязам не верыць» — вялікая латарэя». Дак. фільм [СЦ].
21.50 «Саці. Нясумная класіка...»
22.30 «Марыя Тэрэзія. Жанчына на вайне». Серыял.
1.50 Раман у камені. «Германія. Замак Разенштайн». Дак. фільм.

## Настальгія

6.00 Маст. фільм «Волга-Волга» (12+).
7.45 «На той бок рампы» (12+).
8.30 Маст. фільм «Шчаслівы Кукушкін» (16+).
9.00 «Быў час». 2009 год (16+).
10.00 «Пад знакам задыяка. Рыбы» (18+).
11.30, 13.25, 14.45, 15.40, 17.30, 18.50, 20.10, 21.40, 23.00, 1.05, 3.40, 5.35 Музычная настальгія (12+).
12.00 «Вакол смеху». 1981 год (12+).
13.50 Дак. фільм «Свабода без маскі» (16+).
15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
16.00 Маст. фільм «Кароткія сустрэчы» (16+).
18.00 «СевАлогія». «Пінк Флойд» (18+).
19.10 Маст. фільм «Пацалунак» (16+).
22.00 «Народжаны ў СССР» (12+).
0.00 «Да і пасля...» Год 1989-ы (16+).
1.25 Маст. фільм «Дзёны цягнік» (16+).
4.00 «Колба часу» (16+).
5.00 «Блеф-клуб» (16+).

## EuroSport 1

1.30, 9.30,16.30 Веласпорт. Кюрнэ — Брусель — Кюрнэ (12+).
2.30 Скачкі на лыжах з трампліна. Чэмпіянат свету (12+).
3.30 Горныя лыжы. Кубак свету (12+).
5.00 Лыжнае дваябор'е. Чэмпіянат свету (12+).
8.30 Веласпорт. Het Nieuwsblad (12+).
10.30 Снукер. The Players Championship (6+).
11.55, 21.45 Снукер. Gibraltar Open.
18.00 Веласпорт. «Тур ААЭ» (12+).
19.10 Алімпійскія гульні. Тэлечасопіс «Штодзённая руціна» (12+).
20.10 Алімпійскія гульні. Тэлечасопіс «Удалечыні ад дома» (12+).
21.15 Дзюдо. Вялікі шлем (12+).

## Кінакамедыя

0.30 Як шляхта (16+).
2.45 Белае віно з Бабудою (16+).
4.55 Сакавіцкія каты (16+).
6.40 Ну што, прыехалі? (12+)
8.30 Пампушка (16+).
10.35 Год Свінні (16+).
12.00 Дзядуля лёгкіх паводзінаў (18+).
13.55 Паліцэйскі з Рублёўкі. Навагоднее бязмежжа (16+).
15.40 Паліцэйскі з Рублёўкі. Навагоднее бязмежжа-2 (16+).
17.20 Галівудскія копы (12+).
19.30 Таксі (16+).
21.05 Таксі-2 (16+).
22.40 Нявеста, якая збегла (16+).

## ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма»(12+).
10.10 «M&S» (12+).
10.40 «Лепшы сабака».
11.30 «Перыскоп» (16+).
11.50, 4.30 «Суд ідзе». Дак серыял (16+).
12.55, 17.40 «Сляпая» (16+).
14.05 «Паглядзім» (12+).
14.40 «Любімая дачка таты Карла». Маст. фільм (16+).
16.35 «Чалавек-невідзімка» (16+).
18.50 «Жанчыны» (16+).
19.45 «Скажы мне праўду» (16+).
20.50, 4.05 «Цуд» (16+).
21.25 «Якія вярнуліся» (16+).
22.30 «Косці». Серыял (16+).
0.20 «Грым». Серыял (16+).
1.15 «Акцёрскія драмы» (12+).
2.05 «Прыгажунчык-2». Камедыя (18+).

## ТБ1000

5.00 Зялёная міля (16+).
8.40 Код да Вінчы (16+).
11.25 Анёлы і Дэманы (16+).
13.50, 0.45 Валяр'ян і горад тысячы планет (16+).
16.20 Капітан Крук (12+).
19.00 Пітэр Пэн (12+).
20.55 Блакітная лагуна (16+).
22.50 Вяртанне ў Блакітную лагуну (16+).
2.55 Пяты элемент (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

5.30 Экіпаж (6+).
8.05 Метро (16+).
10.30, 21.00 Дукless-2 (16+).
12.30 Неадэкватныя людзі (16+).
14.20 Неадэкватныя людзі-2 (16+).
16.55 Пра любоў (16+).
19.00 Жыццё і прыгоды Мішкі Япончыка. 1—2-я серыі (16+).
23.00 Тэкст (18+).
1.15 Гуляй, Вася! (16+)
3.25 Сем вячэр (12+).

## National Geographic

6.20 Зрабіць за адзін дзень (16+).
6.40 Інстынкт выжывання (16+).
7.30 Падарожжы з Гордонам Рамзі (16+).
8.20 Ледзяная дарога (16+).
9.10 Машыны: разабраць і прадаць (16+).
10.00, 13.25, 22.40, 1.55 Аўта-SOS (16+).
11.45 Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
12.35, 16.45 Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).
14.20, 23.30 Ліхтугі за мяжой: злачынства і пакаранне (16+).
15.05, 19.20, 0.20 Расследаванні авіякатастроф (16+).
15.55 Служба бяспекі аэрапорта: Бразілія і Перу (16+).
17.40 У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам (16+).
18.30 Фабрыка ежы (16+).
21.00 Злачынствы супраць прыроды (16+).
21.50, 3.30 Кантрабанды (16+).
1.10, 4.20 Асушыць акіян (16+).
5.05 Служба выратавання Аляскі (16+).

## Discovery

8.00, 17.42, 23.06 Склады: бітва ў Канадзе (16+).
8.46, 11.25, 22.12 Махінатары (12+).
9.39 Майстры патаргавацца (12+).
10.32, 21.18 Як гэта зроблена? (12+)
12.18, 3.30 Узрываючы гісторыю (12+).
13.12 Мільярдэр пад прыкрыццем (12+).
14.06 Сямейка Осборнаў — праўда ці хлусня (16+).
15.00, 5.00 Як гэта ўладкавана? (12+)
15.54, 1.47 Музейныя загадкі (12+).
16.48 Круты цюнінг (12+).
18.36, 2.40 Чыгунка Аляскі (16+).
19.30, 4.15 Мяцежны гараж (12+).
20.24, 5.45 Гульня камянёў (16+).
0.00 Аўтасвет Майка Бруэра (12+).
0.27 Супермеханік Энт Энстэд (12+).
0.54 Жаночая аўтамайстэрня (12+).
6.30 Голыя і напалоханыя (16+).
7.15 Аляска: апошні рубеж (16+).

РАЗГЛЕДЖАНА НА СЕСІІ

# ІНВЕСТЫЦЫІ, ЖЫЛЛЁ, АГРАРНЫ БІЗНЕС

## Гродзенскія дэпутаты зацвердзілі рэгіянальныя праекты асноўных дзяржаўных праграм, вызначаных на VI Усебеларускім народным сходзе

**НА чарговай, 32-й сесіі абласнога Савета дэпутатаў разгледжаны вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна ў 2020 годзе і вызначаны далейшыя кірункі работы. Гэта праекты, якія ўваходзяць у склад важных дзяржаўных праграм, зацверджаных УНС. Комплексны план работы рэгіёна па рэалізацыі названых праграм атрымаў падтрымку дэпутатаў і быў прыняты для выканання.**

Нягледзячы на тое, што мінулы год быў няпросты як у знешнеэканамічным, так і ў палітычным плане, рэгіён выстаяў і нават зрабіў крок наперад. У першую чаргу гэта датычыцца аграпрамысловага комплексу, дзе назіраецца добры прырост. А ў цэлым за пяцігодку выпуск прадуктаў харчавання павялічыўся ў два разы.

— Працавалі зладжана, нягледзячы на заклікі да дэстабілізацыі грамадска-палітычнай сітуацыі, да забастовак. Але нашы працоўныя калектывы не паддаліся на гэта. Сумленна працавалі як на ўнутраны, так і на знешні рынак. Экспарт за мінулы год значна вырас. У ліку партнёраў — 120 краін свету, — падкрэсліў **старшыня абласнога Савета дэпутатаў Ігар ЖУК.**

Ён паведаміў, што ў вобласці выкананы ўсе сацыяльныя абавязацельствы, узятыя перад жыхарамі. У першую чаргу, будаўніцтва жылля, у тым ліку для шматдзетных сем'яў. Для гэтай катэгорыі здадзена 1300 кватэр.


Фота grodnonews.by.

Забяспечваецца рост рэальных даходаў насельніцтва, выплат пенсій, сацыяльных дапамог. Увогуле, сацыяльная сфера займае 67 % бюджэту вобласці. Такія ж прыярытэты захаваюцца і на бягучы год.

— Усебеларускі сход паставіў перад намі новыя задачы, — адзначыў Ігар Жук. — Зараз кіраўнікі ўсіх падраздзяленняў, вертыкалі ўлады, у тым ліку і дэпутаты, працуюць над рэалізацыяй Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Гродзенскай вобласці на будучую пяцігодку ў адпаведнасці з рэспубліканскай праграмай. Прыярытэты вызначаны. Гэта, у першую чаргу, рост дабрабыту нашых людзей, і, вядома, развіццё эканамічнага патэнцыялу Гродзенскай вобласці. Драйвераў эканомікі нямала: развіццё нашай традыцыйнай галіны — аграпрамысловага комплексу, рэалізацыя буйных праектаў, такіх як будаўніцтва новага завода «Гродна Азот», малы і сярэдні бізнес, экспартны патэнцыял і прыцягненне прамых замежных інвестыцый.

На сесіі зацверджаны праекты, якія будуць працаваць на перспектыву. Самым значным можна назваць рэгіянальную інвестыцыйную праграму, у рамках якой мяркуецца асвоіць 140 мільёнаў рублёў. Пры гэтым сума можа быць павялічана, бо фарміраванне праграмы пачыналася са 130 мільёнаў рублёў.

Аб тым, як будуць размеркаваны сродкі, дэпутатам паведаміў **старшыня камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Гродзенскага аблвыканкама Міхаіл ПЕТУХ.** Асноўныя фінансы — 82 млн рублёў — накіруюць на жыллё. У тым ліку арэнднае і сацыяльнае. Дарэчы, у Гродне распачата будаўніцтва арэнднага дома, і такія дамы будуць узведзены ва ўсіх раённых цэнтрах.

На аб'екты сацыяльнай сферы накіруюць 40 млн рублёў. Найбольш значныя інвестыцыі плануецца ўкласці ў сферу адукацыі. Так, сёлета пачнецца будаўніцтва чатырох дзіцячых садкоў — у Гродне, Скідзелі, Лідзе і Слоніме. Таксама працягнецца ўзвядзенне анкадыспансера, фізкультурна-аздараўленчага комплексу ў Ваўкавыску, школы алімпійскага рэзерву ў Лідзе.

Дэпутаты падтрымалі комплекс мерапрыемстваў па рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» на пяцігодку. Як зазначыў **галоўны інжынер ЖКГ Гродзенскай вобласці Андрэй КАХНОВІЧ,** праграмай прадугледжана і вырашэнне шэрагу праблемных пытанняў. Плануецца зніжэнне затрат на жыллёва-камунальныя паслугі — не менш як 5 % да папярэдняга года, якаснае водазабеспячэнне ўсіх спажыўцоў. Сёлета плануецца пабудаваць 10 станцый абезжалезвання, а да 2025 года поўнасцю завяршыць выкананне праграмы «Чыстая вада». І, што вельмі важна, да канца пяцігодкі давесці перапрацоўку камунальных адходаў да 64 % ад усяго аб'ёму.

Зацверджаны на сесіі і комплекс рэгіянальных мерапрыемстваў Дзяржпраграмы «Аграрны бізнес». Па словах **старшыні камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні аблвыканкама Валерыя ХЕЛСКАГА,** важная роля адводзіцца раслінаводству, навуковаму падыходу і селекцыйнай рабоце. У жывёлагадоўлі трэба зрабіць стаўку на прадукцыйнасць дойнага статка. Значная ўвага будзе аддавацца развіццю племяннай жывёлагадоўлі, рыбнай гаспадаркі і пчалярства, а таксама меліярацыі зямель, якія выпалі з абароту. На рэалізацыю праграмы плануецца накіраваць 653 мільёны рублёў, у 2021 годзе — амаль 120 мільёнаў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# ВЁСКУ СТРАЦІЦЬ НЕЛЬГА!

**ДЭПУТАТЫ Віцебскага абласнога Савета на пазачарговай сесіі абмяркоўвалі фінансавыя пытанні. Яны зацвердзілі шэраг дакументаў, дзе прапісаны важныя рашэнні і прапановы.**

Напрыклад, ухвалілі падтрымку грашыма маладых ветэрынараў. Нядаўна сродкі масавай інфармацыі паведамілі пра адпаведную ініцыятыву **старшыні Віцебскага аблвыканкама Мікалая ШАРСНЁВА** — дадаткова плаціць па 1000 рублёў у месяц пачаткоўцам у гэтай прафесіі. Гэта тэма і стала адной з першых, што абмяркоўвалі на сесіі народныя выбраннікі. І, бадай, на сёння яна найбольш важная для магчымасці плённага развіцця сельскагаспадарчай галіны Віцебшчыны.

**Старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ** і яго калегі разумеюць усю значнасць праблемы. Як паведаміў **намеснік старшыні аблвыканкама Барыс ЯФРЭМАЎ,** на сённяшні дзень не хапае 123 ветэрынарных урачоў і 86 заатэхнікаў. І размова аб падтрымцы, нагадаў, датычыцца тых, хто сёлета атрымае дыплом. Грошы выплачваюцца пры ўмове, што кантракт будзе заключаны на пяць гадоў. Але «прэмія» будзе налічвацца толькі на працягу першых трох.

На 1000 у якасці бонусу пакуль што могуць разлічваць усяго 88 чалавек. У камітэце па сельскай гаспадарцы і харчаванні Віцебскага аблвыканкама падлічылі, што для бюджэту выдаткі на іх сацыяльную падтрымку будуць параўнальна невялікія.

А нават калі колькасць «стыпендыятаў» павялічыцца, на ўсіх разам сума выплат будзе на ўзроўні 2,7 мільёна рублёў у год. Бюджэту вобласці яна «па кішэні». Аддача пры гэтым будзе вялікая. Ды і жывёлагадоўля — сувязное «звяно» паміж аграномамі і работнікамі вытворчасці мясной і малочнай прадукцыі, таму яе трэба своечасова забяспечваць кадрамі.

Каб моладзь разумела, што такі клопат трэба апраўдаць, ад яе ў сваю чаргу чакаюць добрасумленнай працы. Старшыні райсаветаў пракантралююць, каб у гаспадарках з разуменнем аднесліся да пытання заахвочвання. Канешне, не абыдзецца без пытанняў з боку больш вопытных жывёлаводаў. Ды і чым горш, напрыклад, тыя, хто таксама толькі пачынае працоўную дзейнасць, толькі ў іншай сельскагаспадарчай сферы?

Дарэчы, з часам, як неаднаразова казаў губернатар, усім вяскоўцам трэба будзе годна плаціць. А для гэтага неабходна ствараць (і такіх прыкладаў усё больш) гаспадарчыя ўмовы, якія паспрыяюць высокай прадукцыйнасці працы. Адпаведна, у выніку можна гаварыць і аб высокай фінансавай удзячнасці за нялёгкія і пачэсныя намаганні. Вёску страціць нельга. Гэты заклік кіраўніка дзяржавы атрымлівае рэалізацыю на месцах і нараджае добрыя ініцыятывы.

Таксама дэпутаты — усе без выключэння — прагаласавалі за тое, каб кампенсаваць абласной сістэме аховы здароўя раней незапланаваныя выдаткі на мерапрыемствы супраць пандэміі.

Абмяркоўвалі і пытанні сацыяльнай абароны, стварэння новых рабочых месцаў. Зацвердзілі мерапрыемствы па рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы «Рынак працы і садзейнічанне занятасці» на 2021—2025 гады.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# З НАВАСЕЛЛЕМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

— Вельмі рады, што перасяліліся ў такі выдатны дом. Нам падабаецца, што ёсць магчымасць рэгуляваць падачу цяпла ў кватэру: калі сыходзім з дому, адключаем яго, увечары — дадаём. Цэны за камунальныя паслугі прымальныя, — расказаў глава сямейства Генадзь Сцяпанавіч. У электрадоме катлы для ацяплення і гарачай вады размешчаны ў падвальным памяшканні — гэта дазволіла пазбегнуць устаноўкі ў кватэрах электракатлоў і бойлераў.

Насельніцтва Бальшавіцкага сельсавета — звыш 3180 чалавек, і цяпер яго жыхарамі актыўна становяцца навасёлы. У 60-кватэрны дом з электракацельняй засяліліся дзевяць сем'яў з ліку гамяльчан, што мелі патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, жылі ў інтэрнатах, у дамах, якія былі прызнаны састарэлымі.

— Вельмі ўдзячны за новае жыллё тыя вяскоўцы, хто перасяліўся з былых баракаў, што калісьці ўзводзіліся як часовае жыллё для рабочых пасёлка, — звяртае ўвагу **старшыня Бальшавіцкага сельскага Савета Гомельскага раёна Пётр БУХАВЕЦ.** — Многія мне кажуць — не можам паверыць, што так добра можна жыць!

— Некалькі гадоў таму мы правялі з гэтымі сем'ямі гутарку, растлумачылі, што будзе магчымасць перасяліцца ў новае арэнднае жыллё. Тым, хто згадзіўся перасяліцца, дадзена магчымасць атрымаць грашовую кампенсацыю за іх прыватызаванае жыллё неналежнага стану, — растлумачыў Пётр Бухавец.

Між тым жылы дом з аўтаномнай электракацельняй у пасёлку Бальшавік стаў першым шматкватэрным жыллём у такім выкананні ў Гомельскай вобласці. Відавочны «плюс» дамоў такога тыпу, па словах спецыялістаў, — сюды не трэба пракладваць цеплатрасы і газаправод.

— Сёння ў рэгіёне плануецца пашырыць колькасць жылых аб'ектаў і аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры, якія цалкам абслугоўваюцца праз электрычнасць, — адзначае **дырэктар упраўлення капітальнага будаўніцтва Гомельскага раёна Вячаслаў ТАКАРЭЎСКІ.** — У найбліжэйшых планах нашага прадпрыемства — будаўніцтва мікрараёна з жылой забудовы на тэрыторыі Чонкаўскага сельсавета. Запланавана будаўніцтва мікрараёна ў Сеўруках, дзе ў васьмі жылых дамах будзе выкарыстоўвацца электраэнергія. Новае жыллё разлічана на пражыванне 2200 чалавек.

Сёлета ў пасёлку Бальшавік будзе таксама ўзведзена падобнае жыллё на 40 кватэр. Вядома, што вырашыць свае жыллёвыя праблемы і засяліцца ў новы электрадом змогуць як жыхары Гомельскага раёна, так і абласнога цэнтра, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні ўмоў пражывання.

Сёлета на Гомельшчыне плануецца здаць у эксплуатацыю больш за 16 тысяч квадратных метраў электрадамоў. Гэты від жылля з'явіцца ў Тураве, рабочым пасёлку Сасновы Бор, што ў Светлагорскім раёне, а таксама ў Калінкавічах, Петрыкаве, Брагіне і Гомелі.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

ЗАКАНАДАЎСТВА

# КУПЛЮ СТАРЫ ДОМ У ВЁСЦЫ ЗА... 29 РУБЛЁЎ

**ГЭТА сапраўды стане магчыма пасля таго, як будзе прыняты ўказ аб адчужэнні жылых дамоў і ўдасканаленні работы з пустуючымі і старымі дамамі. Як адзначыў старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Дзмітрый МАТУСЕВІЧ, праект гэтага дакумента ўжо ўзгоднены з усімі зацікаўленымі структурамі.**

Нагадаем, што заканадаўчая ініцыятыва накіравана на ўдасканаленне парадку ўключэння ў абарот пустуючых і старых дамоў у сельскай мясцовасці.

Па словах старшыні Дзяржкаммаёмасці, гэтым указам сапраўды будуць дадзены мясцовым уладам пэўныя паўнамоцтвы. «Самае галоўнае — спрошчаны парадак. Напрыклад, у некаторых населеных пунктах будзе дазволена прадаваць такі аб'ект (пусты, стары дом) адразу за адну базавую велічыню. Тут павінна быць вельмі тонкая мяжа паміж інтарэсамі ранейшых уласнікаў, якія ўжо рэальна не карыстаюцца і не хочуць, ці, магчыма, у іх ёсць нейкія прычыны, па якіх яны не дагледаюць сваю маёмасць і зямельны ўчастак. Мы спрабуем гэта таксама якасна ўрэгуляваць», — сказаў кіраўнік Дзяржкаммаёмасці.

Вырашаць жа гэта пытанне, на яго думку, павінны выключна мясцовыя ўлады, таму што яны лепш бачаць сітуацыю на месцах.



Варта заўважыць, што гэта ўжо другая спроба па змене заканадаўства, якая павінна аблягчыць працэс куплі старых дамоў на вёсцы. Сёння працэс уключэння дамоў у абарот займае занадта шмат часу. Так, спачатку мясцоваму органу ўлады трэба прызнаць дом старым або пустуючым. Потым павінен прайсці год. Калі ўласнік за гэты час не распачне ніякіх мер (па аднаўленні, рэканструкцыі), то далей рыхтуюцца дакументы ў суд. Пасля рашэння суда аб пераходзе аб'екта ў камунальную ўласнасць яго рыхтуюць да продажу — афармляюць усе дакументы, вызначаюць рынкавы кошт. Толькі пасля гэтай абавязковай працэдуры інфармацыя аб продажы з'яўляецца на сайце выканкама і ў раённай газеце. Потым арганізуюць аўкцыён і прадаюць дом.

Улетку мінулага года Прэзідэнт нашай краіны даручыў спрасціць продаж пустуючай зямлі ў вёсках і каля іх. І вось цяпер пустуючыя дамы ў пэўных раёнах можна будзе прадаваць па спрошчанай схеме, за 29 рублёў (адна базавая велічыня), без складанай працэдуры ацэнкі нерухомасці.

Дзмітрый Матусевіч паведаміў і аб праводзімай інфарматызацыі. Паводле яго слоў, 2020 год паказаў, што інфармацыйныя рэсурсы Дзяржкаммаёмасці запатрабаваныя не толькі самой сістэмай, але і знешнім контурам, гэта значыць нацыянальнай эканомікай. У прыватнасці, завершана работа над геаінфармацыйнай сістэмай «Лясныя рэсурсы» (сумесны праект з Мінлясгасам), якая дазволіць на падставе зямельных картаў планаваць развіццё лясной гаспадаркі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

НА ЎЗРОЎНІ

# БУДНІ АДНОЙ ГАСПАДАРКІ

## Трэба не ламаць, а ўдасканальваць тое, што створана папярэднімі пакаленнямі

**КІРАЎНІКОМ трэба нарадзіцца, кажуць адны. Кіраўніком становяцца ў працэсе работы, набываючы прафесійны вопыт, сцвярджаюць іншыя. Яшчэ не нарадзіўся той чалавек, які б усё ведаў, лічыць дырэктар сельскагаспадарчага філіяла «Клецкі» ААТ «Слуцкі сыраробны завод» Аляксандр ПЛЯШЭВІЧ. «Чым больш пачынаеш унікаць у нейкую справу, капаць глыбей, тым больш разумееш, што шмат чаму трэба вучыцца. Я да гэтага часу атрымліваю інфармацыю з інтэрнэту, іншых крыніц, са зносін з калегамі», — кажа ён.**

Аляксандр Пляшэвіч закончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію, прайшоў розныя прыступкі службовай лесвіцы. Працаваў аграномам, намеснікам начальніка па раслінаводстве ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання райвыканкама, у камітэце сельскай гаспадаркі і харчавання Мінаблвыканкама. Калі яго бацька, кіраўнік гаспадаркі, сышоў на заслужаны адпачынак, сын папрасіўся на яго месца. І вось ужо пяць гадоў узначальвае сельгасарганізацыю. Дарэчы, ён нарадзіўся тут, у Клецкім раёне, у вёсцы Сякерычы. Рашэнне пераехаць на малую радзіму, як і выбар прафесіі, былі не імгненныя. З дзяцінства ён звыклы да сялянскай працы. Даводзілася і сена нарыхтоўваць, і бульбу садзіць ды выкопваць, і сеяць, і араць, і свойскую жывёлу даглядаць. Нават карову даіў уручную, а калі стажыраваўся ў Германіі, навучыўся даіць рагуль апаратам.

— Мне хацелася прыносіць карысць роднай вёсцы, малой радзіме, землякам, — кажа мой суразмоўнік.

І гэта яму ўдалося. СФ «Клецкі» — адна з найлепшых гаспадарак раёна. Тут займаюцца вытворчасцю малака, раслінаводствам, вырошчваннем яблыкаў і ягад. Апошнім часам актыўна абнаўляецца яблыневы сад, толькі за апошнія чатыры гады пасаджана 90 гектараў яблынь і шэсць гектараў буякоў. Сёлета ў гаспадарцы чакаюць першых вынікаў, таму што цана на гэтыя ягады добрая, і яны карыстаюцца попытам. Для захавання пладоў і ягад пабудаваны два сховішчы. Паралельна вядзецца раскарчоўка старога саду. «Калі пяць гадоў таму я прыйшоў у гаспадарку, тут былі плантацыі 50—60-х гадоў мінулага стагоддзя. Яны не прыносілі якаснага ўраджаю, а толькі займалі плошчу. Вызваленыя 350 гектараў зямлі прыцягнулі ў кармавы севазварот, што дазволіла за апошнія пяць гадоў павялічыць аб'ёмы нарыхтоўкі сіласу, сенажу і забяспечыць жывёлу якаснымі кармамі. Сёлета амаль удвая павялічылі плошчы пад рапс. Менавіта гэтая культура вырашае праблему бялку для жывёлы. Значную ўвагу аддаём вытворчасці камбікармоў. ААТ «Слуцкі сыраробны камбінат» набыў перасоўны млын, якім па чарзе карыстаюцца гаспадаркі, што сюды ўваходзяць. Гэта на 5 % змяншае сабекошт малака».



Фота з сайта клецкай раённай газеты «Да новых перамог».

Грамадскі статак налічвае 3568 галоў, у тым ліку 1306 кароў. Сярэдні надой на карову летась — 7187 кілаграмаў малака, на 35 кілаграмаў больш, чым у пазамінулым годзе. Выручка ад рэалізацыі прадукцыі да ўзроўню 2019-га павялічылася на 114 %.

У 2017 годзе пачалі рэканструкцыю малочнатаварнай фермы Палаўковічы з будаўніцтвам кароўніка і даільнай залы, а таксама рэканструкцыю двух старых кароўнікаў. У кастрычніку 2020-га закончылі рэканструкцыю аднаго з іх. Другі плануюць завяршыць у 2021-м. Гэта дазволіць павялічыць статак на 300 кароў, а вытворчасць малака — на 1950 тон, выручку ад рэалізацыі малака на 1230 тысяч рублёў. Пастаянна набываецца новая тэхніка. Куплены раскідвальнік мінеральных угнаенняў, мікрааўтобус, тры аўтамашыны МАЗ, самазвал грузападымальнасцю 20 тон, здрабняльнік-змяшальнік кармоў, сеялка, два малочныя таксі і іншае.

***— Аляксандр Іванавіч, бытуе думка, што нам непатрэбныя буйныя сельгасарганізацыі, яны неэфектыўныя. Маўляў, фермеры цалкам могуць накарміць людзей. Разам з тым, мяркуючы па паказчыках вашай гаспадаркі, яна развіваецца, рухаецца наперад.***

— Давайце разважаць лагічна. Дапусцім, будуецца вялікі комплекс, для забеспячэння яго электрычнасцю дастаткова аднаго трансфарматара, гноепрыбіральшчыка і так далей. Ды і ўся тэхніка сканцэнтравана ў адным месцы. Колькасць людзей для абслугоўвання комплексу меншая, а зарплата ў іх большая. Таму я, наадварот, прыхільнік буйной вытворчасці. Лічу, што дробныя фермы трэба ўзбуйняць. Гэтак жа і ў раслінаводстве. Энерганасычаную тэхніку абслугоўваюць, напрыклад, два чалавекі, а зрабіць на ёй могуць значна больш. Цяпер мы аснасцілі яе сістэмай падрульвання, навігацыі, кантролю паліва, што ўплывае на якасць работ. Паступова пераходзім на лічбавізацыю. Камп'ютар будзе цалкам кантраляваць, дзе на полі ўнеслі ўгнаенне, ход сеялкі па адной каляіне. Лічбавізацыя закранула і бухгалтэрыю, дзе сканцэнтравана ўся інфармацыя, вынікі работы, справаздачы. За лічбавізацыяй будучыня. Дэмаграфічная сітуацыя пагаршаецца, колькасць сельскага насельніцтва змяншаецца. Менавіта пра лічбавізацыю народнай гаспадаркі, у тым ліку і аграрнага сектара, шмат гаварылася на Усебеларускім народным сходзе. Гэты кірунак прадугледжваюць і асноўныя палажэнні Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2021—2025 гады.

Як дэлегат сходу, я ўважліва выслухаў даклад Прэзідэнта, выступленні яго ўдзельнікаў. І лічу, што ў сельскай гаспадарцы выбраны правільны, узважаны кірунак. Нельга ламаць тое, што створана працай многіх пакаленняў. Неабходна ўзводзіць будучыню на тым, што ўжо ёсць, рухацца наперад, удасканальвацца.

***— Цяпер, калі ўзровень вытворчасці іншы, на змену прыйшлі і прыходзяць новыя сучасныя тэхналогіі. Патрэбны высокапрафесійныя кадры, якія маглі б працаваць на новай тэхніцы.***

— Навучыць простага механізатара новаму можна хутка і без значных затрат. Было б жаданне. Накіраваць на курсы, запрасіць адпаведна спецыяліста на месца... Мы ў гэтым кірунку працуем увесь час, запрашаем вучоных, консультантаў.

Гаспадарка практычна ўкамплектаваная кадрамі, цякучка нязначная. Адна з прычын — выгаднае геаграфічнае становішча, сельгасарганізацыя знаходзіцца непадалёку ад райцэнтра. Акрамя таго, спецыялістаў і работнікаў прыцягваюць жыллём, дастойнымі зарплатамі. У калектыве дзейнічае ўзаемазамяняльнасць, каб у чалавека быў выхадны. А калі такіх дзён не выпадае ў сезон сельскагаспадарчых кампаній, то работнікам плацяць за іх у двайным памеры.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;

**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 14.804.** **Нумар падпісаны ў 19.30 25 лютага 2021 года.**

Ініцыятыва

# ГУНЬКА ДЛЯ ЦЯЛЯТ

## Клецкі раённы камбінат бытавога абслугоўвання асвойвае новыя віды дзейнасці

**Цяпер ужо ніхто не здзіўляецца, калі на вуліцы сустракае дамашніх гадаванцаў, у асноўным сабак, у камбінезонах розных колераў і фасонаў, аздобленых надпісамі, упрыгажэннямі, з капюшонамі і без. А вось на Клецкім раённым камбінаце бытавога абслугоўвання насельніцтва асвоілі выпуск адзення для... нованароджаных цялят. Не, заказваюць яго сельгасарганізацыі не дзеля таго, каб малыя выглядалі модна і эфектна. Гунькі дапамагаюць цяляткам захоўваць здароўе, аберагаюць іх ад непагадзі. І пачуваюць у новым «убранні» яны сябе камфортна і ўтульна.**

Каму належыць такая крэатыўная ідэя?

— Вырабляем гунькі для цялят, што ўтрымліваюцца ў сельскагаспадарчых арганізацыях раёна з тканіны Оксфард 600, якую пастаўляем з адной са сталічных фірм, — уводзіць у курс справы **начальнік вытворчасці РКБА Ірына ПРАХАРЭНКА.** — Гэтая тканіна са спецыяльным прамочваннем, воданепранікальная звонку, што добра абараняе ад дажджу і снегу. Падкладка зроблена з натуральнай бязі, якая ўтрымлівае 100 % бавоўны. Яна мяккая і прыемная навобмацак. У камізэльцы прадугледжаны і слой сінтэпону, што дазваляе ўтрымліваць цяпло.

***— А як вы шыеце адзенне? Здымаеце мерку па індывідуальным заказе?***

— Гэтыя гунькі ўніверсальныя, рэгулююцца спецыяльнымі рамянямі на засцёжках на памеры і аб'ёме жывёліны. Іх можна замацаваць так, каб яны не перашкаджалі цяляці вольна сябе пачуваць. Пры беражлівых адносінах да гэтых пакрывалаў яны могуць служыць не адзін сезон. «Адзенне» можна памыць, пачысціць, прасушыць, і яно зноў будзе як новае, — запэўніла Ірына Георгіеўна.

На камбінаце шыюць гунькі для нованароджаных цялят другі год. У снежні 2019-га сшылі першую партыю. Першым заказчыкам быў племянны завод «Чырвоная Зорка» Клецкага раёна. Затым падцягнуліся і іншыя аграрыі. Толькі летась па заказе ўсіх сельгасарганізацый вырабілі 500 адзінак. А наогул іх колькасць ужо набліжаецца да тысячы.



Такія камізэлькі шыюць для цялят.

Фота з сайта клецкай раённай газеты «Да новых перамог».

— Нядаўна нам патэлефанавалі з ААТ «Васілішкі» з Гродзенскай вобласці. Яны даведаліся, што мы займаемся, так бы мовіць, спецадзеннем для цялят, і заказалі 150 камплектаў. Днямі будзем адгружаць гатовую партыю, — уступае ў размову **дырэктар камбіната Алена ГАДЛЕЎСКАЯ.** — Кошт адной камізэлькі — 36 рублёў. Гэта, лічу, нядорага, паколькі іх можна выкарыстоўваць не адзін сезон. Але самае галоўнае, што гэта камфорт і здароўе для цялят.

***— Калі на ўзор «Верцялішак» да вас звернуцца заказчыкі з іншых абласцей краіны, справіцеся?*** — пацікавілася ў суразмоўніцы.

— Мы прымем любы заказ, чым больш, тым лепш для нас. Вядома, 30—50 тысяч адразу не зможам сшыць. Наша прадпрыемства невялікае, таму для гэтага недастаткова вытворчых магутнасцяў. А вось 1000—3000 — калі ласка. У нас сем швачак-краўчых. Гэта вопытныя і прафесіянальныя спецыялісты, якія шмат гадоў працуюць на прадпрыемстве.

— Мы таксама закупляем у камбіната бытавога абслугоўвання камізэлькі для цялят, — кажа дырэктар сельскагаспадарчага філіяла «Клецкі» ААТ «Слуцкі сыраробны камбінат» Аляксандр Пляшэвіч. — Выкарыстоўваем іх, як правіла, зімой, калі на вуліцы ветрана, марозна. Цяля, пакуль стане на ногі, падужэе, мае патрэбу ў цяпле.

***— А што, яно мерзне ў памяшканні, каля маці?*** — цікаўлюся ў Аляксандра Іванавіча.

— Калі цялятка нарадзілася, то яно дванаццаць гадзін абсыхае пад лямпай. Затым яго дзесьці на дваццаць адзін дзень змяшчаюць на вуліцу, каб выпрацаваўся імунітэт. Вось тут і спатрэбіцца для яго «адзенне». У гэтай камізэльцы яно — нібы чалавек у цёплай куртцы.

У ААТ «Шчэпічы-Агра» пасля цялення малое адымаюць ад маці і селяць у спецыяльныя індывідуальныя домікі з чыстай падсцілкай. Вядома, яны абаронены ад неспрыяльных умоў надвор'я. Але цяляты маюць патрэбу ў дадатковым абаграванні. Сухое цяля можа ўтрымлівацца і пры мінусавай тэмпературы, але як толькі яно прамокне або пабудзе на скразняку, то можа захварэць. Таму вельмі важна, каб яно было абаронена ад вільгаці і ветру.

Спецыялісты-аграрыі даказалі, што ў выкарыстанні камізэлькі ёсць вялікія перавагі. У прыватнасці, захваральнасць маладняку зніжаецца амаль на 20 %, а кожныя суткі ён прыбывае ў вазе на 100 грамаў і больш.

У РКБА шыюць не толькі аксесуары для жывёлы. Тут асвоілі таксама выпуск спецвопраткі — касцюмаў з камбінезонамі, паўкамбінезонамі, штанамі, уцепленых куртак, камізэлек, мужчынскіх і жаночых халатаў з нейлону, плашчовай тканіны.

Калектыў пастаянна ў творчым пошуку па ўкараненні эфектыўных формаў работы, новых паслуг. Напрыклад, тут пачалі вырабляць біг-бэгі. Гэта вялікія мяхі з поліпрапілену для збожжа. Іх заказваюць сельгасарганізацыі. Але яны выкарыстоўваюцца сезонна. Напрыклад падчас уборкі ўраджаю. У мінулым годзе ў камбінаце купілі новую швейную машыну для выпуску гэтай тары. І цяпер шукаюць пастаянных спажыўцоў, з якімі можна працаваць круглы год. А бігбэгі апошнім часам карыстаюцца попытам у многіх прадпрыемстваў. У прыватнасці, у іх можна ўпакоўваць пелеты, торфабрыкеты, харчовыя тавары. Пытанні паставак прадукцыі на некаторыя фірмы ў стадыі прапрацоўкі.

Канешне, цяжка канкурыраваць у сферы бытавых паслуг з прыватнымі фірмамі, асабліва з буйнымі. Таму бытавікам даводзіцца спяшацца за ўсім новым, працаваць на апярэджанне, каб захаваць кліентаў і максімальна прыцягнуць новых. У РКБА працуе пральня, аснашчаная неабходнай тэхнікай, якая аказвае паслугі па мыцці бялізны насельніцтву, арганізацыям.

— Нашы кліенты — Клецкі фізкультурна-аздараўленчы цэнтр з басейнам, сельскагаспадарчы ліцэй, цэнтр па забеспячэнні бюджэтных арганізацый. Мы ўдзельнічаем у закупках на электроннай гандлёвай пляцоўцы. Спажыўцы ўмеюць лічыць кожную капейку і стараюцца эканоміць. Таму цана паслугі, якая прапаноўваецца, павінна адпавядаць якасці. Мы заключылі дагаворы на мыццё бялізны з Баранавіцкім, Нясвіжскім каледжамі, некаторымі мінскімі школамі. Імкнёмся павялічваць аб'ёмы, каб цалкам загрузіць пральню. Акрамя таго, у нас ёсць цырульня, дзе працуюць чатыры сапраўдныя прафесіяналы сваёй справы, у якіх пастаянная кліенцкая база. І хоць у Клецку шмат прыватных цырульняў, людзі ідуць да нас. І гэты аб'ект у нас працуе з прыбыткам, хоць і невялікім. Майстры выязджаюць па заяўках і ў сельскую мясцовасць — кагосьці падстрыгчы, некаму зрабіць укладку, іншаму — прычоску, — кажа дырэктар.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ

# «На прыроду са «Звяздой»

I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Рэкламная гульня пад назвай «На прыроду са «Звяздой» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі: тэрмін з 1 сакавіка 2021 года па 30 чэрвеня 2021 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на другі квартал ці першае паўгоддзе 2021 года.

2. Арганізатар Гульні — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — Установа), месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, УНП 100155376.

II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «На прыроду са «Звяздой» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара гульні — рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда», — і складаецца з наступных рэчаў:

| № п/п | Назва | Колькасць (шт.) | Цана за шт., руб. кап. | Усяго з ПДВ, руб. кап. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Грыль-барбекю Boyscout 61252, (далей — суперпрыз) | 1 | 205,18 | 246,22 |
| 2 | Тэрмасумка Bradex TD 0669 (сіняя), (далей — прыз) | 7 | 44,02 | 369, 77 |

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «На прыроду са «Звяздой» складае 615,99 (Шэсцьсот пятнаццаць) рублёў 99 капеек.

III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ

4. Рэкламная гульня «На прыроду са «Звяздой» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на другі квартал ці першае паўгоддзе 2021 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які аформіў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на другі квартал ці першае паўгоддзе 2021 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас Установы ў перыяд з 1 сакавіка 2021 года па 12 красавіка 2021 года выразаная з газеты або з дадатковага ўкладыша запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая змяшчаецца ў газеце не менш чым раз на тыдзень у перыяд з 1 сакавіка па 12 красавіка 2021 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя або тыя, якія паступілі Установе пасля 12 красавіка 2021 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ

9. Для правядзення Гульні «На прыроду са «Звяздой» Установа стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні (далей — Камісія) у наступным складзе:

Крачава Наталля Ільінічна — намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы Выдавецкі дом «Звязда» — старшыня Камісіі.

Члены Камісіі:

Чычко Аксана Мікалаеўна — начальнік упраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта»;

Дашкевіч Юлія Андрэеўна — намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы Выдавецкі дом «Звязда»;

Доўнар Валянціна Аркадзеўна — рэдактар аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» рэдакцыйна-выдавецкай установы Выдавецкі дом «Звязда»;

Брашко Алег Мікалаевіч — загадчык адміністрацыйна-гаспадарчага сектара рэдакцыйна-выдавецкай установы Выдавецкі дом «Звязда».

10. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі гэтай Гульні.

V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ.
ПАВЕДАМЛЕННЕ ПЕРАМОЖЦАМ

11. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 16 красавіка 2021 года ў 12 гадзін у памяшканні Установы па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

12. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

13. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываюцца 7 прызоў (па аднаму для кожнага).

Затым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз.

14. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз, лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні, прадстаўнікоў незалежных арганізацый або члены Камісіі. На кожнай такой картцы ўдзельніка надпісваецца выйграны прыз і распісваюцца члены Камісіі.

15. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 26 красавіка 2021 года ўключна ў газеце «Звязда».

Установа ў тэрмін да 26 красавіка 2021 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ

16. Умовай выдачы прызоў і суперпрыза з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на другі квартал ці першае паўгоддзе 2021 года.

Пры звяртанні па атрыманне прыза або суперпрыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза або суперпрыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на другі квартал ці першае паўгоддзе 2021 года.

17. Адсутнасць у пераможцы, які выйграў прыз або суперпрыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на другі квартал ці першае паўгоддзе 2021 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза або суперпрыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

18. Прызы і суперпрыз выдаюцца пераможцам у тэрмін па 30 чэрвеня 2021 года ў памяшканні Установы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9:00 да 13:00 і з 14:00 да 17:00, з панядзелка па суботу (выдачу ў суботу неабходна ўзгадніць з арганізатарам гульні па тэлефонах (017) 263 66 73, 311 17 40 для атрымання прапускных дакументаў). Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў па атрыманне прыза або суперпрыза, Установа не аплачвае.

19. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

20. Пасля 30 чэрвеня 2021 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

21. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

22. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, прозвішчы, імёны па бацьку, фатаграфіі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны Установай у любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць Установе.

23. Правілы правядзення рэкламнай гульні «На прыроду са «Звяздой» да пачатку рэкламнай гульні будуць апублікаваны сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда».

24. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефонах (017) 263 66 73, 311 17 40.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3945 ад 23.02.2021 г., выдадзенае Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

# АБЫСЦІСЯ БЕЗ ВОЛЬТАВАЙ ДУГІ

## Гутарка з кіраўнікамі і спецыялістамі Інстытута зваркі і ахоўных пакрыццяў, што працуе ў складзе акадэмічнага Інстытута парашковай металургіі імя акадэміка А. У. Романа НАН Беларусі

Спачатку — інтэрв'ю з **дырэктарам, кандыдатам фізіка-матэматычных навук, дацэнтам Міхаілам АНДРЭЕВЫМ.**

— Сёння з выкарыстаннем зваркі ў краіне ствараецца больш за палову ўнутранага валавога прадукту. Паўсюдна, дзе выкарыстоўваюцца нераздымныя зварныя злучэнні — у машынах, будынках, збудаваннях, мастах, трубаправодах і гэтак далей — зварны шоў забяспечвае іх бяспеку і працаздольнасць.



Дырэктар Інстытута зваркі і ахоўных пакрыццяў Міхаіл АНДРЭЕЎ з дыпломам лаўрэата міждзяржаўнай прэміі «Зоркі Садружнасці».

На адасобленым гаспадарча-разліковым структурным падраздзяленні «Інстытут зваркі і ахоўных пакрыццяў» для вырашэння пытанняў у інтарэсах зварачных вытворчасцяў краіны створаны падраздзяленні, якія ахопліваюць дзейнасць ад распрацоўкі ТНПА (Нацыянальны тэхнічны камітэт ТК BY 5 «Зварка і роднасныя працэсы»), атэстацыі зваршчыкаў, кваліфікацыі тэхналагічных працэсаў да правядзення выпрабаванняў у акрэдытаванай кантрольна-выпрабавальнай лабараторыі.

Інстытут таксама займаецца ахоўнымі пакрыццямі. Сёння мы можам наносіць пакрыцці для рознага функцыянальнага прызначэння таўшчынёй ад долеў мікрона — на ўзроўні нанаметраў, да міліметровых. Тоўстыя потым апрацоўваюцца, у выніку матэрыял належным чынам абаронены і можа эксплуатавацца зноў.

Да нас часта звяртаюцца прадпрыемствы, у якіх знасілася тая ці іншая дэталь імпартнага абсталявання. Асобна яе ніхто не прадасць, таму патрэбна якасна адрамантаваць. Звяртаецца знакаміты «Нафтан» — зношваюцца плунжары французскіх помпаў, выручаем. Працуем з «Гомсельмашам», «Ростсельмашам», наогул з буйнымі прадпрыемствамі Саюзнай дзяржавы. Наносім нават вакуумныя пакрыцці на рэжучы інструмент — для яго ўмацавання і далейшага выкарыстання.

Асвоілі так званыя цвёрдазмазачныя пакрыцці, якія выкарыстоўваюцца там, дзе вадкая змазка не падыходзіць, напрыклад, у космасе. Узаемадзейнічаем з «Пеленгам», а гэта сур'ёзная фірма, і выконваем для іх пакрыцці на тыя ці іншыя іх вырабы з дабаўленнем цвёрдай змазкі. Такім спосабам забяспечваецца працаздольнасць гэтых вырабаў у вакууме. Займаемся таксама каразійнатрывалым пакрыццём — дабаўляем у матэрыялы для пакрыцця айчынныя ультрадысперсныя алмазы.

Нашы палімерныя пакрыцці служаць больш доўга і надзейна, чым самая лепшая фарба. Ёсць так званае халоднае цынкаванне — апрацаваную паверхню можна нейкім чынам падрапаць, але яна сама «зажыўляецца». Тэхналогія цікавая, практычная і запатрабаваная.

Адным словам, сёння ў галіне ахоўных пакрыццяў мы можам працаваць ва ўсіх дыяпазонах і вырашаць складаныя задачы, якія паўстаюць перад навукова-вытворчай практыкай. Перавага ў нас шмат, досвед таксама накоплены, так што запрашаем вытворцаў да супрацоўніцтва.

Усё новае стараемся дэманстраваць на міжнародных канферэнцыях і семінарах.

## ЗВАРНЫ ШОЎ МАЦНЕЙШЫ ЗА МЕТАЛ

Да размовы далучаецца **намеснік дырэктара, кандыдат тэхнічных навук Аляксандр РАДЧАНКА:**

— Сёння ў свеце ў ліку кірункаў, што найбольш інтэнсіўна развіваюцца ў галіне зваркі, з'явіўся новы спосаб — зварка трэннем з перамешваннем, які ажыццяўляецца без плаўлення матэрыялаў. Калі гаварыць папулярна, спрошчана, то зварка трэннем з перамешваннем выконваецца вярчальным інструментам у форме стрыжня. Па сутнасці, гэта электрод, які не расходуецца. Памеры і састаў яго канструкцыйных элементаў выбіраюцца ў залежнасці ад матэрыялаў, якія патрэбна зварыць, і іх таўшчыні. Інструмент рухаецца ўздоўж кантаў (кромак) зварваемых дэталяў, і за кошт высокай хуткасці яго вярчэння абедзве паверхні награваюцца ад трэння да пластычнага стану. Пры гэтым адбываецца перамешванне, узаемнае пранікненне матэрыялу ў кантах. У выніку за інструментам фарміруецца плоскі зварны шоў, які можа быць нават больш трывалы, чым самі зварваныя матэрыялы.

У гэты час няма працэсу плаўлення, а таму няма крышталізацыі і няма дэфектаў, звязаных з крышталізацыяй. Сабекошт працэсу ў некалькі разоў ніжэйшы за звычайную зварку. А яшчэ не выкарыстоўваюцца прысадачныя матэрыялы, газы, таму адсутнічаюць выдзяленні ў атмасферу. Сёння такая больш экалагічная зварка трэннем усё шырэй укараняецца ў вытворчасць.

Яшчэ адна перавага новага метаду ў тым, што ён дазваляе зварваць не толькі аднародныя, але і разнародныя матэрыялы, з рознай тэмпературай плаўлення, не парушаючы іх хімічнага саставу.

Сёння ў інстытуце праводзяцца работы як па даследаванні новага працэсу, так і па стварэнні ўмоў для яго ўкаранення на прадпрыемствах краіны.



Адказны за накірунак Яўген МАНОЙЛА.

## ПЕРАЙСЦІ РУБІКОН

**Адказны за накірунак газатэрмічнага (газаполымнага) нанясення пакрыццяў, кандыдат тэхнічных навук Яўген МАНОЙЛА:**

— Мы займаемся ўдасканаленнем традыцыйных тэхналогій нанясення пакрыццяў на разнастайныя паверхні матэрыяламі ў форме шнуроў, дротаў і парашкоў. Яны ахопліваюць усю гаму зыходных матэрыялаў — ад палімераў, металаў да керамікі.

Нанясеннем пакрыццяў на тыя ці іншыя дэталі займаемся па заказах прадпрыемстваў і арганізацый. Раней нашы напрацоўкі наогул былі цесна звязаны з наяўнымі праблемнымі кірункамі. Напрыклад, у лёгкай прамысловасці распрацавалі і ўкаранілі на некалькіх прадпрыемствах тэхналогію рамонту і аднаўлення дэталяў ткацкіх станкоў.

Наша тэхналогія традыцыйна выкарыстоўваецца на «Гомсельмашы» — для нанясення цвёрдасплаўных пакрыццяў на нажы і іншыя дэталі кормаўборачнай тэхнікі, пры гэтым рэсурс рэжучых органаў павялічваецца на парадак. Што раней было праблематычна, бо гэтыя органы актыўна зношваліся і часта не адпрацоўвалі нават сезон. З нашым удзелам было арганізавана напыленне таўшчынёй ад 0,2 мм да 1 мм, пры гэтым адбываецца самазаточванне рэжучага інструмента, і праблема практычна знята.

У свой час канадская фірма звярнулася з праблемай рамонту плунжараў у глыбінных вінтавых помпах для адкачкі нафты са свідравін. Шляхам нанясення напылення пытанне ўдалося вырашыць, і цяпер нашы партнёры шырока выкарыстоўваюць гэтую тэхналогію самастойна. Мы ўкаранілі яе і на АТ «Мунаймаш» у Рэспубліцы Казахстан, працягваем з імі супрацоўнічаць. Як і з шэрагам расійскіх заводаў па вытворчасці плунжарных помпаў.

Укаранілі вельмі цікавую сваю распрацоўку па нанясенні пакрыццяў у аморфным стане. Тэхналагічна гэта вельмі складаная задача. Тым не менш удалося яе вырашыць і паспяхова прымяніць у нашай краіне. У Гродна ёсць фірма «Біган», вытворца каўбасных абалонак, пастаўляюць іх па ўсім свеце. Папрасілі аднавіць барабан дыяметрам 160 см і шырынёй 35 см. Выканалі гэтую работу, выкарыстаўшы расійскі аморфны матэрыял борхроммалібдэн. Напылілі пакрыццё на тры барабаны, і яны працуюць абсалютна надзейна.



Электрод з высокай дакладнасцю дакранаецца да ўчасткаў дэталі, якія патрабуюць аднаўлення пакрыцця.



Адказны за накірунак Сяргей ЛАВЫГІН.

Знакамітаму БелАЗу ўмацавалі велізарныя шворны паваротнага кулака для аўтамабіля грузападымальнасцю 120 тон, дзе патрабуецца высокая зносастойкасць і належная засцярога ад карозіі.

У сваіх тэхналогіях мы змаглі перайсці сапраўдны Рубікон — павялічыць цеплавую магутнасць спажывання апаратамі замест ранейшых 30–35 да 80–85 кілават пры спальванні не ацэтылену, а газу МАФ. Удалося гэта дзякуючы і змяненню канструкцыйных параметраў абсталявання (формы, памераў і колькасці каналаў саплавога муштука), а таксама выкарыстанню парашкоў у якасці матэрыялу для напылення. Арыгінальнае канструкцыйнае рашэнне абараніла апаратара ад так званага «зваротнага ўдару». Такім чынам, удалося стварыць клас абсталявання для нанясення пакрыцця метадам наплаўкі таўшчынёй слаёў 10–15 мм на дэталі вялікіх памераў і абаранілі іх не толькі надзейна, але і больш хутка па часе.



Загадчык сектара Дзмітрый БУБЕН аглядае ўзоры зваркі, атрыманыя метадам трэння з перамешваннем.

Адным словам, дзякуючы прымяненню парашкоў мы прасунуліся ў тэхналогіі, удасканалілі абсталяванне, ды і саму тэхналогію. Працаваць можна больш эфектыўна ў 3–10 разоў пры не горшых, а часта і лепшых якасных паказчыках. У гэтым і быў сэнс нашага навуковага пошуку.

## ЗА «ДРУГІМ ЖЫЦЦЁМ» — ДА НАС

**Адказны за накірунак электрафізічных пакрыццяў Сяргей ЛАВЫГІН:**

— Займаемся прымяненнем мікраплазма-іскравых тэхналогій, часцей за ўсё — у рамонтнай вытворчасці. Аднаўляем дэталі, якія выйшлі са строю, пасадачныя месцы на валах і падшыпніках, накрыўках электрарухавікоў і гэтак далей. У прынцыпе, тэхналогіі электраіскравога легіравання прызначаны для аднаўлення і ўмацавання любых токаправодзячых матэрыялаў адвольных памераў і канфігурацыі, што працуюць у складаных вытворчых умовах.

Мікраплазменную іскравую апрацоўку, якая ўключае мікралегіраванне паверхні з адначасовым яе ўмацаваннем, за кошт аплаўлення і фарміравання паверхневага слоя, прымяняем з адначасовым ультрагукавым уздзеяннем. Гэта наш «вытворчы сакрэт», без чаго высокага выніку дабіцца складана. У прынцыпе, усё гэта дазваляе не толькі ўмацоўваць паверхні дэталяў, але і адначасова аднаўляць іх, працягваць тэрмін міжрамонтнай эксплуатацыі.

У чым перавага метаду? У магчымасці выкарыстоўваць у якасці легіруючых электродаў складанакампанентныя альбо сінтэзаваныя кампазітныя матэрыялы. Менавіта яны здольныя ствараць на рабочай паверхні шматфункцыянальныя пакрыцці. Пры гэтым значна меншая энергаёмістасць, адпаведна, і кошт у параўнанні з іншымі метадамі. Не адбываецца страта першапачатковых уласцівасцяў вырабу. Магчымая і такая тэхналогія, калі зверху наносім рабочае пакрыццё з дарагой складаналегіраванай сталі ці вальфрама-кобальтавага сплаву, а пад імі застаецца больш танны метал. Дэталь становіцца даўгавечнай.

Шмат гадоў супрацоўнічае з намі вядучы вытворца ЦЭНаў (цеплаэлектранагравальнікаў) у краіне — ЗАТ «Адзіполь». У іх вытворчасці шмат спецыфічных, скажам так, дэталяў і інструменту, аднаўленне якіх — наш клопат. Іншыя прадпрыемствы прывозяць нам зношаныя крышкі электрарухавікоў, валы і гэтак далей. Аднаўляем, часта нават не разбіраючы саму буйную дэталь.

Выкарыстоўваем і тэхналогію мікрадугавога аксідзіравання для дэталяў са сплаваў А 1. Напрыклад, часта выконваем гэтую работу для лагойскага «Лекфарма». Пакрыццё тэрмастойкае і антыпрыгарнае.




Пакрыццё гэтых разнастайных па форме дэталяў паспяхова выканана метадам электраіскравога легіравання.

На любым з прадпрыемстваў вельмі шмат тэхналагічнага абсталявання. Час ад часу яму патрэбна дарыць другое жыццё. Звяртаюцца да службаў галоўных механікаў: такі падарунак можам зрабіць мы. Будзе і танна, і «сярдзіта».

Публікацыю падрыхтавалі **Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ, Вольга ГЕЦЭВІЧ і Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).**

УНП 102312084




## ЗА ДВУМА ЗАЙЦАМІ...

...Гэты вясковец быў вельмі шчыры працаўнік, да таго ж ніколі не кваліўся на чужое, нават на калгаснае. «Хоць бы ты буракоў калі ў воз укінуў, — бурчэла яго жонка, — ці мяшок камбікорму». — «Э не, — стаяў на сваім Іван, — яшчэ возьмуць ды зловяць... Сораму не абярэшся».

Вось такі ён быў чалавек. Нездарма насіў ажно дзве мянушкі: «камуніст» і «ленінец».

А працаваў ён санітарам пры ветлячэбніцы, з часам набіраўся вопыту і ўжо нароўні з фельчарам мог вылечыць карову, каня ці іншую жывёлу. Людзі раз-пораз звярталіся да Івана, і ніякіх разлікаў тады ён не прызнаваў — апроч, можа, бутэлькі... Здаралася, лішнюю чарку браў, што камуністу ды ленінцу не рабіла, вядома ж, гонару...

А да ўсяго быў гэты дзядзька заўзятым рыбаком і пчаляром. Прычым рыбалоўства ўдавалася лепш: ён меў сваю лодку, змайстраваў сетку-ляшчоўку... «Завялікія вочкі, — казалі яму вяскоўцы. — Уся рыба паўцякае назад у возера». — «І няхай сабе, — адказваў рыбак. — Малая — мне без патрэбы: я такой і вудачкай нацягаю. А сеткай — толькі буйных ляшчоў».

І галоўнае, што Іван не толькі гаварыў так. Ён яшчэ і лавіў: яго рыбы хапала і сваёй сям'і, і радні з суседзямі...

З мёдам, з пчалярствам было горш: хацелася чалавеку павялічыць пчальнік, аднак, як ні стараўся, гэта яму не ўдавалася: то зімою пчолы загінуць, то летам рой «уцячэ».

Неяк збіраецца Іван на рыбалку.

— Сушыце сена, — загадвае сваім (лужок каля хаты скошаны). — І сачыце за пчоламі! Райніцу (гэта спецыяльная скрынка для іх) я выставіў, вёдры з вадой, пілу, малаток і венік — таксама. Сёння павінен быць рой. Як лавіць, спадзяюся, помніце?

Жонка, яго сын з нявесткай і дачка згодна заківалі галовамі.

Разам яны падварушылі сена, на ім, духмяным, прыселі адпачыць. Да кампаніі далучылася суседка: разгаманіліся, разамлелі пад цёплым сонейкам... Аж чуюць — шум у іх над галовамі! Узнялі вочы — рой.

Дачка тут жа ўскочыла на ровар і куляй да возера — клікаць бацьку. Сын стаў грукаць малатком па піле. Жонка з суседкай схапілі вёдры з вадой ды венік...

І ўсё дарэмна, бо «дастаць» вялікую хмару з пчол было немагчыма: яна падымалася ўсё вышэй і вышэй і ўрэшце знікла з вачэй за возерам...

— Упусцілі, разявы! — закрычаў Іван, саскочыўшы з ровара. — Але ж гэта нічога: я даганю... Я, здаецца, ведаю, дзе рой сеў... У Генадзевым садзе, у пустым вуллі.

Карацей, пчаляр узяў райніцу і пайшоў да таго Генадзя.

— Браток, — сказаў, павітаўшыся, — у цябе мае пчолы. Аддай!

— Былі твае, сталі мае, — пасміхаўся Генадзь, але ж потым палагаднеў:

— Забірай, калі твае....

З той вялікай радасці пчаляр нават не пачакаў, пакуль пчолы абсядуць ды скучацца: паспешліва, без дымара, стаў перасаджваць іх у райніцу.

Тыя, як маглі, «супраціўляліся»: кусалі яму рукі, шыю, твар, аднак ленінец не зважаў ні на што: выграб пчолак, амаль подбегам накрочыў дадому.

Ішоў і бачыў, як зараз прынясе свой рой, як пасадзіць...

А вось пад ногі ён зусім не глядзеў, таму не дзіва, што зачапіўся за нейкую жэрдку і грымнуў вобзем.

Не без таго — пабіўся, але ж самае крыўднае, што з райніцы высыпаў пчол!..

Тых, зусім нямногіх, што цудам засталіся, нанач занёс у варыўню, зачыніў дзверы — нават шчыльна, курыца б не вылезла! А вось пчолкі...

Яны, разварушаныя, знайшлі-такі дзірачкі і да раніцы выбраліся на вуліцу, запаланілі двор, пакусалі ката, сабаку, паразганялі ўсіх людзей...

Факт, што загадзя падрыхтаваны вулей, у якім ленінец ужо бачыў свой новы рой, застаўся пусты. А незадачлівы пчаляр са скрухай мусіў прызнаць, што, пагнаўшыся за двума зайцамі, і праўда, не зловіш ніводнага.

Вось і ён у той дзень і без рыбы застаўся, і рой упусціў.

Адным словам, хацеў як лепей, а вось атрымалася, — як некалі... У тых жа камуністаў і ленінцаў.

**Фаіна Касаткіна,**
*г. Паставы.*

## ЧЫТАЙЦЕ ПРЭСУ

Стась Зюка, малады кіроўца бартавога ГАЗ-51, пасля работы спяшаўся дамоў... Што не дзіва: на дварэ май месяц, гарачая пара, калі і ў калгасе работы па вушы, і дома не менш. Сёння вечарам Стасевы бацькі планавалі вывезці гной, заўтра — пасадзіць бульбу. Насенне ўжо зачакалася...

На паўдарозе да вёскі Стась дагнаў свайго бацьку. Той абачліва саступіў на абочыну. Сын... пранёсся міма.

— Ты чаму не спыніўся? — дома спытаў стары.

— Дык я ж прэсу чытаў, — стаў тлумачыць сын. — А там напісана: калі чалавек хоча, каб яго падвезлі, ён падымае руку. Ты ж не падымаў? Не. Дык скуль мне ведаць, хочаш ты пад'ехаць ці не? Можа, на прагулянку выйшаў...

Прамаўчаў тады бацька, бо што тут будзеш казаць — дурны, але ж сын. Ды і гной накідваць трэба...

Каб хутчэй было, суседзяў паклікаў: усе разам упіраюцца, віламі махаюць... Хіба Стась сачке — капот у свайм «газіку» падняў ды калупаецца там.

— Ты што — не дапаможаш? — цікавіцца бацька.

— А кожны павінен сваё рабіць, — адказвае сын. — Вунь і ў газетах пра тое пішуць... Я ж шафёр, а не грузчык...

Пасля работы гаспадыня сабрала на стол: нарэзала сала, дамашняй каўбасы, салёных агурочкаў, насмажыла патэльню яек. Гаспадар дастаў вялікую пляшку гарэлкі, наліў па першай — усім, апроч сына.

— А мне? — нагадвае той. — Ты забыўся ці што?

— Дык прэсу ж трэба чытаць, — усміхаецца бацька. — Там заўсёды пішуць, што шафёры не п'юць. Ім нельга.

**Іван Пяшко,**
*г. Шчучын.*

## У СТРАХА ВОЧЫ ВЯЛІКІЯ

Для пачатку — трохі лічбаў: дзяцей у мяне пяцёра (тры дачкі і два сыны), дзесяць унукаў, сем праўнукаў. Як сабраліся ўсе разам, каб мае 80 адзначаць, дык аж хата гудзела! Ведама, свята...

У будныя дні вось такой грамадой мы, вядома, не збіраемся, у нас іншы парадак заведзены: позняй восенню дзеці забіраюць мяне ў горад, а вясной (я дачакацца не магу!) прывозяць назад у сваю хаціну, і тут ужо я прымаю дзяцей.

Яны часта прыязджаюць — калі каму выпадае. І ў доме тады прыбяруць, і гарод дагледзяць, і ў грыбы, у ягады сходзяць... А бліжэй да вечара смакаты нагатуюць — і ў альтанку... Бывае, па чарцы возьмуць, і пайшлі-паехалі — успаміны, жарты, смех.

І мне тады радасць, што дружная сям'я, што адно аднаму памагаюць, што над капейкай не дрыжаць — не лічаць, хто больш патраціў, хто каму вінен. А што пад'юджваюць адзін аднаго, дык такой бяды. Неяк нават мне дасталося: маўляў, такога зяця страціла — такога мацака (спіна, як грубка ў зале!) ад нашай Іры адпудзіла... І рагочуць, аж заходзяцца.

А ўсё было да развалу Саюза. Вяселлі ў нашай вёсцы гулялі гучна: сталы накрывалі ў сталоўцы, ансамблі запрашалі з Маладзечна ці нават з Мінска, на танцы ішлі ў клуб.

У вёсцы шмат дзяўчат харошых было, так што хлопцы з усёй акругі збіраліся — хто пехатой, хто на матацыклах (машын не дакупіцца тады — чарга... Пакуль падышла, грошы як карова языком злізала).

Дык вось тым суботнім вечарам моладзь у нас на двары сышлася — гамоніць, жартуе, чакае, калі ў клуб музыканты прыйдуць. А ў мяне ж зусім іншыя клопаты — гаспадарскія. Акно, помню, адчыніла ды пытаю ў сваіх: «Юрку прывялі?» Сяргей (гэта сын): «Прывялі... Не хвалюйся». Я ў працяг: «Глядзіце ж, каб напаілі!»

Пасля гэтага якраз пачулася музыка, моладзь пайшла ў клуб. А да мяне назаўтра — суседка з самага ранку з папрокамі: маўляў, што ты пляменніку майму сказала?

А я ж у вочы яго не бачыла: не выходзіла ў двор... Чаго мне да моладзі лезці?

Кажу гэтак, а Таццяна не верыць, пытае, а чаму тады ён на танцы не пайшоў: «Яву» сваю асядлаў і куляй дадому... «А вось гэта, — кажу, — ты ў яго самога пытайся».

На тым і размове нашай канец, хоць, трэба сказаць, што быў і пачатак, бо таго пляменніка Таня дужа нахвальвала, усё хацела з Ірай маёй пазнаёміць. Казала, што добрая пара была б...

У наступную суботу прыязджае мой Сяргей, распытваю ў яго пра тое, пра гэта... Вяселле ўспомнілі. Пытаюся: «Ці быў жа тут Таццянін пляменнік?» Сын кажа: «Быў». — «А не ведаеш, чаму ўцёк?» Той памаўчаў, падумаў і ў рогат: «Дык яго ж, — кажа, — Юркам завуць. Як нашага бычка... Ты пыталася, ці прывялі яго, ці напаілі, а ён, відаць, спалохаўся — падумаў, што зараз накачаюць тут да страты прытомнасці ды з Ірай нашай пажэняць...»

Во як атрымалася. Можа, і добры зяць быў бы?..

**А. С.,**
*г. Вілейка.*

**Рубрыку вядзе**
**Валянціна ДОЎНАР.**

***Ад яе ж чарговае і шчырае:** «Пішыце», бо ўсе «вясёлыя і праўдзівыя гісторыі з жыцця чытачоў» на старонках «Звязды» не проста друкуюцца, а ўдзельнічаюць у конкурсе на найлепшую. Вынікі яго будуць падведзены ў пачатку наступнага года. Журы — і вялікае чытацкае пад старшынствам спадарыні Соф'і Кусянковай з Рагачоўшчыны, і маленькае рэдакцыйнае на чале з першым намеснікам галоўнага рэдактара спадарыняй Наталляй Карпенкай — працуе. Пераможцаў чакаюць прызы.*

Неасабісты суб'ектыў



# «ТРЭНЧ» — ГЭТА ВАМ НЕ ПЛАШЧ?

## Пра чысціню мовы і не толькі

ЗДАЎНА, яшчэ з часоў работы рэдактарам аддзела пісьмаў, я проста абажаю такія чытацкія лісты. Нібы крылы за спінай вырастаюць, бо разумееш, што складаеш літары ў сказы недарэмна, што ўсё гэта заўважае, аналізуе разумны, удумлівы і — галоўнае — неабыякавы чытач. Наш, «звяздоўскі», такіх больш ні ў адной газеты няма — у гэтым маё глыбокае, шматгадовае, няхай сабе і крыху суб'ектыўнае перакананне.

Вось, напрыклад, хто як не наш чытач стане разважаць пра чысціню беларускай мовы і ў жыцці, і на старонках газеты? А мы такія пісьмы, у якіх і пытанні, і заўвагі, атрымліваем нярэдка. Адзін такі допіс прыйшоў акурат перад Днём роднай мовы з Маладзечна. Яго аўтар Алена Сымановіч, філолаг, разважае пра памылкі, якія трапляюцца ў газеце, але больш — пра засмечанасць нашай мовы словамі іншамоўнага паходжання.

ДЗЯКУЙ нашай чытачцы — яна цытатай з артыкула Кузьмы Чорнага «Небеларуская мова ў беларускай літаратуры» натхніла знайсці і пачытаць гэтую публікацыю (а напісаны артыкул быў амаль сто гадоў таму — у 1928 годзе). Пісаўся ён, канешне, тады, калі «мова толькі пачынала крышталявацца», але тым, хто рупіцца аб яе захаванасці, не пашкодзіць пачытаць яго і сёння. Бо, пагадзіцеся, амаль сто гадоў мінула, а не страціла актуальнасці вось гэта, напісанае са скрухай і з іскрыстым гумарам адначасова: «Загаловак: «Над абрывам». Аўтар думаў «над обрывом» і напісаў «над абрывам». Не ведаючы, што ў беларускай мове «абрыў» гэта значыць «парсюк лычам дрэва абрыў». Ці вось гэта: «Сапраўды, што гэта «вясна наступіла»? Наступіць можна (думаючы ў беларускай мове) каму-небудзь на нагу, можна наступіць на жабу і растаптаць яе. Але аўтар думаў: «Весна в этом году наступила как-то рано». І пісаў гэта беларускай транскрыпцыяй, зменьваючы, як умеў, некаторыя словы». Карацей, артыкул надзвычай цікавы. На нашым сайце мы зрабілі спасылку, калі цікавіцеся, можаце пачытаць яго цалкам. Але ёсць рэчы, якія пісьменнік у тым артыкуле не закрануў, бо проста з імі не сутыкаўся, але якія вельмі актуальныя сёння (на што і звяртае ўвагу наша чытачка).

З русізмамі, якія і цяпер прысутнічаюць у нашай мове, нават у 1928-м Кузьма Чорны ведаў, што рабіць: трэба шукаць і знаходзіць свае адпаведнікі, «але дзеля гэтага трэба вывучыць мову, калі ўжо не давялося ведаць яе змалку». Проста і складана адначасова, але ж выканальна. А вось як быць з неславянскімі словамі, якія апошнім часам, асабліва ў маладым асяроддзі, сталі неад'емнай часткай і нашай «векавой у казачнай красе», і «великого и могучего»? Куды падзець гэтыя «хайпы», «дэдлайны», «інсайты»? Як сходу, не задумваючыся, ужываць замест іх «навязлівая рэклама», «канчатковы тэрмін», «азарэнне»? Ці варта гэта рабіць, калі нават чалавек, які ведае мову, «завісае» і не можа імгненна знайсці «родны» адпаведнік? Я ўжо не кажу пра нейкія паняцці, якія ўвогуле не маюць адпаведнікаў, — напрыклад, «біткоін».

Сама стараюся падобных слоў пазбягаць (атрымліваецца не заўсёды), чытачоў як рэдактар матэрыялаў калег, таксама звяртаю на гэта ўвагу. І вымалёўваюцца вельмі цікавыя нюансы. Напрыклад, у публікацыі пра вясновую моду зачапілася за «мастхэў», «оверсайз», «світшот», «трэнч». Першыя два словы яшчэ можна замяніць на больш зразумелыя, але грувасткія фармулёўкі — «тое, што павінна быць у кожнага» і «на некалькі памераў большы». А вось світшот — гэта ж не проста світар, гэта асобны від адзення, «гібрыд» світара і футболкі, а трэнч — хоць па сутнасці свайй і плашч, але ж асаблівы — так называюць толькі плашч двухбортны. Дык ці варта тут яшчэ больш усё заблытваць, спрабуючы спрасціць?...

ЗРЭШТЫ, усе гэтыя філалагічныя загадкі, сумненні і спрэчкі маюць у сабе адзін надзвычай пазітыўны момант. Яны — сведчанне таго, што напісанае Кузьмой Чорным у 1928-м: «Мова — жывая істота. Яна не жыве, а існуе», і сёння — праўда. Пакуль мы спрачаемся пра яе правапіс, пра ўжыванне ў ёй тых ці іншых слоў, пакуль на ёй гаворым, пішам, думаем — яна існуе. І гэта самае галоўнае. І для мовы, і для нас, калі хочам звацца беларусамі.

А што да іншамоўных слоў, дык вельмі разумна, на мой погляд, сказаў падчас круглага стала ў «Звяздзе» доктар філалагічных навук, загадчык кафедры медыялінгвістыкі і рэдагавання нашага журфака Віктар Іўчанкаў: «А што за праблема, сябры мае? Гэта ж сёння не толькі беларускай мовы праблема — усіх моў свету. Мы ўвайшлі ў абсалютна новую эпоху, якая вымагае іншай лексікі. У 20-я гады мінулага стагоддзя, напрыклад, адбываўся адваротны працэс — прыхільнікі пурызму (чысціні мовы) навыдумлялі слоў, якія павінны былі замяніць запазычанні з іншых моў. Большасць наватвораў так і засталася ў гісторыі, але ж некаторыя сталі часткай літаратурнай мовы: цягнік, жыццяпіс, лецішча, суладдзе... Гэта натуральны працэс развіцця мовы. Мова з цягам часу сама адшліфуе, што застанецца ва ўжытку, а што пяройдзе «ў пасіў» у яе карыстальнікаў».

ДАРЭЧЫ, ці ведаеце вы, што самае беларускае слова «бульба» паходзіць ад французскага bulbe — «цыбуліна, клубень»? Жывая мова выбрала і захавала.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении 30 марта 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Банк Дабрабыт»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | |
|---|---|---|
| Наименование, местонахождение и характеристики продаваемого имущества | Начальная цена, бел. руб. (с учетом НДС) | Размер задатка, бел. руб. |
| Изолированное помещение с инвентарным номером в ЕГРНИ 500/D-628167, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Стадионная, 14-4, общая площадь – 545,0 кв.м, назначение – помещение многофункциональное, наименование – гараж-стоянка на 9 автомобилей со вспомогательными помещениями, СТО и ФОКом в блоке с гаражами ГСК «Милавица» | 742 723,20 | 74 000,00 |

**Продавец имущества:** ОАО «Банк Дабрабыт», ул. Коммунистическая, 49, пом. 1, 220002, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условия торгов**:

1. Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

2. Расходы, связанные с государственной регистрацией договора купли-продажи и основанных на нем прав, оплачиваются победителем торгов (покупателем).

Торги проводятся в соответствии со статьями 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Банк Дабрабыт», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие с организатором торгов соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в срок не более 20 рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи имущества.

Торги проводятся **30 марта 2021 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 01.03.2021 по 26.03.2021 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:** (017) 365 48 36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 239-19-26 (ОАО «Банк Дабрабыт»).

Дополнительная информация размещена на официальном сайте организатора торгов – www.mgcn.by.

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Минский мясокомбинат» (продавец) проводит открытый аукцион**

## ПО ПРОДАЖЕ ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ
### наименование – торговое помещение,

**инв. № 500/D-70782710, общая площадь – 688,4 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 500000000008001861 площадью 0,8257 га**
***(общее долевое право аренды по 30.09.2053, доля в праве 239/5000)***
**по адресу: г. Минск, ул. Веры Хоружей, 15-3Н.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона линий связи и радиофикации, пл. 0,0090 га; охранная зона электропередачи, пл. 0,0090 га; охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, пл. 0,0450 га; охранная зона сетей и сооружений канализации, пл. 0,1800 га; охранная зона сетей и сооружений теплоснабжения, пл. 0,1480 га; охранная зона сетей и сооружений газоснабжения, пл. 0,0880 га.*

*Объект обременен договором аренды по 10.05.2021.*

Начальная цена с НДС **– 1 868 160,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены **– 186 816,00** бел. руб.). Стоимость снижена на 20 %.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 1 (одного) процента.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 21.01.2021.

Аукцион состоится **09.03.2021** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **05.03.2021** до **15.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

**Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17, 8 (029) 136-31-11.**

УНП 100003394

---

**Общество с ограниченной ответственностью «ДеПартола» (далее – «Эмитент») в связи с реорганизацией 29.12.2020 Общества с ограниченной ответственностью «Галерея Мегаполис» в форме присоединения к Обществу с ограниченной ответственностью «УНИГРАН», на основании протокола заседания внеочередного общего собрания участников Эмитента от 08.02.2021 № б/н,**

**ВНОСИТ СЛЕДУЮЩИЕ ИЗМЕНЕНИЯ в жилищные облигации 2-го выпуска**

Вместо поручительства Общества с ограниченной ответственностью «Галерея Мегаполис» исполнение обязательств Эмитента по 200 Облигациям обеспечивается поручительством Общества с ограниченной ответственностью «УНИГРАН» (Республика Беларусь, 220005, г. Минск, ул. Веры Хоружей, 4, помещение 12, каб. 68, УНП 192742965). Договор о предоставлении поручительства от 5 ноября 2020 г. № б/н и дополнительное соглашение к нему от 8 февраля 2021 г. № 1.

Общество с ограниченной ответственностью «УНИГРАН» принимает на себя безусловное и безотзывное обязательство солидарно с Эмитентом исполнить обязательства перед владельцами 200 Облигаций в объеме 582 400 белорусских рублей в случае неисполнения либо ненадлежащего исполнения данных обязательств Эмитентом.

*Указанные изменения зарегистрированы Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 22.02.2021.*

УНП 193458450

---

## ИЗМЕНЕНИЕ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

**по объекту «Жилая усадебная застройка для многодетных семей в микрорайоне Сокол в г. Минске» 1-я очередь строительства,**
***опубликованную в газете «Звязда» № 104 (29218) от 30.05.2020***

«Окончание строительства – апрель 2021 года».

УНП 192400611

---

Утерянные квитанции форма 1-СУ, серия СВ №№ 0618749, 0618750, 0618751, 0618752, 0618753, 0618754, 0618755, договоры страхования форма 2РН, серия ЗИ № 0000981, форма 2РН, серия ЗС № 0002056 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительными.**

---

### Уважаемые акционеры
## ОАО «Дрожжевой комбинат»!

**29 марта 2021 года в 10.00**

**СОСТОИТСЯ ГОДОВОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ по адресу: г. Минск, ул. Октябрьская, 14, актовый зал**

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

